„Васілёчкі" ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Беларусы ў Літве ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 45 (2791) Год LIV | Беласток, 8 лістапада 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

У пошуках памяці

У дзень Усіх Святых сустракаюся ля сходаў Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы са спадаром Васілём Сакоўскім, настаўнікам і беларускім дзеячам. Сёлета развіталіся мы з чарговым, аддадзеным справе музея чалавекам, з Міхалам Голубам. Тры гады ўжо няма з намі Кастуся Майсені. Памяць пра іх застаецца, але наш абавязак — працягваць іх справу. Музей стаіць і развіваецца ў культурным плане. Ці гэта абазначае, што беларускасць, якая ў Гайнаўцы мае свае добрыя традыцыі, зусім не прападзе?

— Каго з заслужаных беларускасці ў Гайнаўцы ўспамінаеце ў такі дзень?

— Здаецца ўсіх, з якімі я працаваў. У нас была вельмі сямейная атмасфера. Мы ж працівалі дарогі, і з беларускасцю, і з адносінамі да нас, а нялёгкі быў час. Таму думаю, што ўсе, якія працавалі ў карысць беларускасці, з'яўляюцца заслужанымі. Дырэктар Аляксандр Іванюк разумеў гэта, таму моцна займаўся беларускімі справамі. У пачатках былі Ніна Нічыпарук, Васіль Бахар, Васіль Літвінчук, Васіль Дзун ды іншыя. Шмат людзей, якіх варта помніць.

— Здаецца мне, што памяць пра такія асобы гіне ў нас.

— Час зацірае сляды, так мусіць хіба быць. Штораз больш такіх, якія пра нашых пачынальнікаў не ведаюць, нават сярод настаўнікаў. У школе захоўваюцца дакументы і кніжка, якую мы напісалі з дырэктарам Іванюком. Спадзяюся, хтосьці яшчэ зоймецца гэтымі тэмамі і раскажа нам больш.

— Я, як выпускніца Белліцэя, не помню, каб мы ўшаноўвалі памяць піянераў беларускасці ў Гайнаўцы.

— Так яно і ёсць. У час, калі была народная ўлада, вучні глядзелі на нас як на „камухаў", хаця ўсе мы імі не былі. У школе настаўнікі не займаліся памяццю. Разам з дырэктарам Васілём Дамброўскім прыйшлі новыя парадкі, які замацаваліся да сёння і не магу сказаць, што яны дрэнныя. Аляксандр Харкевіч, настаўнік, але і першы выпускнік нашага ліцэя, шмат чаго добрага зрабіў для захавання памяці. Ён калісьці перад днём настаўніка распытваўся пра ўсялякія падзеі і людзей. Да сёння водзіць на могілкі зацікаўленых беларускай гісторыяй.

— Ці ў Гайнаўцы існуе беларуская гістарычная памяць?

— Здавалася б, што моладзь не цікавіцца нашай гісторыяй, але гэта няпраўда. Беларускасць становіцца нават стылем жыцця. Гляньце як зараз маладыя лезуць на сцэны, цікавяцца беларускім словам і песняй — ад найменшых да найбольшых. Таго не было. Такім чынам захоўваецца і гістарычная памяць.

— З настаўніцкім рухам у Гайнаўцы звязаны таксама і трагічныя лёсы.

— Гэта выпадак Ніны Нічыпарук.

— У Вашай кніжцы чытаем, што загінула яна ў дарожным здарэнні ў 1944 годзе.

Злева: Янка Хіліманюк у размове з Васілём Сакоўскім

— Так, бо ведаеце, яшчэ раней адкрыта пра некаторыя справы гаварыць было немагчыма. Такім чынам памяць пра такія выпадкі заціралася. Праўдападобна было так, што затрымалі яе машыну і забілі, але гаварыць пра тое нельга было. Таксама і Васіля Бахара вывезлі ў лагеры. А яны ж вучылі ў беларускіх школах. Не думаю, што займаліся нейкай іншай дзейнасцю.

* * *

Вуліцамі Гайнаўкі пераходзім на праваслаўныя могілкі. Гутарка працягваецца. Пераходзячы праз вароты, спадар Сакоўскі кідае ўсім па чарзе сімвалічную залатоўку. Ідзем у бок магілы Аляксандра Іванюка, дырэктара Гайнаўскага белліцэя ў 1981-1991 гадах.

— Добры дзень, — спадар Сакоўскі цёпла вітаецца з Янкам Хіліманюком, адным з першых выпускнікоў нашага ліцэя ў 1953 годзе. — Помніш можа, што сталася з Нінай Нічыпарук?

— Ведаю толькі, што гэта не было звычайнае дарожнае здарэнне, але дакладна вам не раскажу. Ведаю толькі, што яна пахаваная ў Нараўцы.

— А наведваеце магілы сваіх настаўнікаў з Беларускага ліцэя? — працягваю.

— Бывае, што хаджу на магілы, але не ў такі дзень. У такі дзень няма чаго тут шукаць. А калі прыйду, то заглядаю да Сафроненкі, яна мяне вучыла, Дзуна... Калісь быў на яго магіле, але зараз не ведаю, куды падацца.

— Думаеце ў нас, гайнавян, існуе беларуская нацыянальная памяць? — пытаю.

Спадар Янка задумваецца на пару секунд.

— Ведаеш, у такой моладзі як мы ёсць гістарычная памяць, але выбачай, такая моладзь, як вы, ужо забывае.

— Але бываюць і маладыя, якія прынамсі цікавяцца, — дадае спадар Сакоўскі. Янка Хіліманюк падтакнуў і мы развіталіся.

* * *

— Ці на нашых могілках можна знайсці надпісы на беларускай мове? — пытаюся ў спадара Сакоўскага ля магілы дырэктара Іванюка.

— На жаль, няма помнікаў з беларускай мовай.

— Чаму так? Нястача адвагі?

— Не думаю, хаця бывала, што раскрадалі літары, нават польскія. Ведаеце, можа не таму, што не хочуць, але з гэтым бываюць складанасці. То шаблонаў нама. То часу няма гэтым заняцца. Вось так. Давайце можа пройдзем яшчэ да Анастасіі Тропак.

— Добра помніце дырэктар Тропак?

— Яна прымала мяне на працу. Нават жылі мы ў адным будынку нейкі час. Яна з мамай і дачкой, а дачка вучылася ў нашым ліцэі.

— Як Анастасія Тропак захавалася ў Вашай памяці?

— Гэта было ваеннае пакаленне, якое перажыло страшныя падзеі. Яна была ж у канцлагеры. Людзі гэтага пакалення былі такія збітыя, нервовыя, выпрабаваныя жыццём. У яе была вялікая любоў да настаўніцтва, да школы, вынесеная з хаты, бо і бацька быў ангажаваным настаўнікам у Кобрыне. Прыслалі яе сюды з Беларусі на пасаду дырэктара беларускай школы, значыцца, і ў нацыянальным плане яна была неабыякавай. Але не мяняе гэта факту, што гэта было няшчаснае пакаленне.

— Гайнаўка мае спрыяльныя ўмовы для беларускасці?

— Перад усім маем ліцэй. Людзі са свету прыязджаюць менавіта сюды, бо іх гэта цікавіць. На гэтым можам скарыстаць, можа скарыстаць беларуская памяць і маладыя людзі, якія часам выязджаюць, а пасля многіх гадоў усведамляюць сабе, што беларускасць гэта частка іх і вяртаюцца зусім адмененымі.

Ілона КАРПЮК

Свіслач • Гародня • Ваўкавыск • Шчучын • Гайнаўка • Высокае • Масты • Беласток • Бельск-Падляшскі • Самятычы

98,1 FM

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

www.racyja.com

Абаронцы роднай культуры ☞ 2

Ганна КАНДРАЦЮК

Праз момант я ўявіла сабе, што прыязджаю ў Беласток з далёкага горада і, звычкай прыезджых, шукаю аб'явы пра культурнае жыццё горада. Мяне здзіўляе прысутнасць тут плакатаў з кірыліцай. Аб'явы пра беларускія канцэрты. Праз момант я здзіўляюся: адкуль яны тут? Адказ прыходзіць сам з сябе: я ведаю, што Беласток непадалёк Беларусі. Значыць, у нас справа з класічным памежжам. І мне цікава пазнаёміцца з гэтай адметнасцю, параўнаць горад з іншымі, пабачыць яго ў гістарычным і этнічным кантэксце...

Узнагароджаныя за закрытымі дзвярыма ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

Пушча буйнее ☞ 9-10

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

9 770546 196000

Як у Кітаі

Беларусь зноў збіраецца запускаць свой касмічны спадарожнік. Гавораць, што гэты яшчэ лепшы, чым першы, ад якога па сённяшні дзень не паспелі пазбіраць усіх асколкаў. Той спадарожнік называўся „Белка". Як называецца гэты пакуль не гавораць. Але зразумела і так, што не „Вавёрка". Ды і не важна, як ён там будзе называцца. Галоўнае, каб яго распрацоўшчыкі змаглі задаволіць амбіцыі галоўнага ідэолага ператварэння Беларусі ў касмічную краіну. Не па-сапраўднаму ў касмічную, а так, для затуманьвання мазгоў электарата. Але больш за ўсё, зноў жа, для тых самых амбіцый галоўнага ідэолага. Таму не мае аніякага значэння ці прынясе той спадарожнік хоць нейкую практычную карысць, ці не.

Тыя амбіцыі маюць той жа самы характар і тыя самыя крыніцы паходжання, як і амбіцыі па ператварэнні Беларусі ў краіну з атамнай энергетыкай. Прыкладам японцы, якія атамныя станцыі лічаць учарашнім днём, робяць стаўку на новыя тэхналогіі і ўжо збіраюцца будаваць электрастанцыю ў космасе ды браць адтуль энергію. І зробяць такое, бо дбаюць пра карысць для нацыі. Уласныя амбіцыі кіраўніка краіны там лічацца справай выключна асабістай і выдаткаў з дзяржаўнага бюджэту на іх задавальненне не прадугледжваецца. Таму, калі што запускаецца ў космас, то выключна дзеля карысці Японіі.

Сказаць што мы, беларусы, нашмат багацейшыя за японцаў, і таму можам дазволіць сабе якія хочам выдаткі, не было б невялічкай праўдай, а наадварот, вялікай няпраўдай. Пацверджаннем гэтаму служаць статыстычныя звесткі з адпаведных дзяржаўных службаў. Адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі павялічылася. І не проста павялічылася, а павялічылася моцна. Знешнія пазыкі таксама павялічыліся адэкватна адмоўнаму сальда знешняга гандлю. Амбіцыі кіраўніцтва (пра гэта дзяржаўная статыстыка маўчыць) па ператварэнню Беларусі ў атамную і касмічную краіну не зменшыліся.

Браць прыклад з японцаў беларускія кіраўнікі не хочуць. Відаць, добра разумеюць, што гэта справа бессэнсоўная. У першую чаргу таму, што і палітычныя сістэмы, і эканамічныя, розныя. Лепш малпаваць стыль паводзін з кітайцаў. Тым больш, што сённяшняя сітуацыя ў Беларусі і Кітаі ў палітыцы і эканоміцы ў нечым падобная.

Мяркуйце самі. У беларускіх школах вучаць кітайскую мову. У кітайскіх таксама. У Кітаі няма беларускамоўных школ. У Беларусі таксама. Стасункі Кітая з Расіяй, ЗША, Еўрасаюзам і іншымі краінамі прыкладна падобныя да беларускіх. Палітычная мадэль ледзь не ідэнтычная. У эканоміцы, з большага, тэндэнцыі таксама параўнальныя — гэта ўпартая праца над вынаходніцтвам свайго ровара, якая называецца „ўласная ўнікальная мадэль эканамічнага развіцця".

Вось і кіраўнік беларускай дзяржавы, ён жа і галоўны ідэолаг атамнай энергетыкі Беларусі, і галоўны ў беларускім прарыве ў космас, і галоўны ў вынаходніцтве „ўласнай унікальнай мадэлі эканамічнага развіцця", і галоўны ў пабудове сваёй палітычнай мадэлі, і „прочее, прочее, прочее...", публічна ўспомніў Кітай. Ён заявіў, што нам трэба апрануць і накарміць усяго дзесяць мільёнаў чалавек. А ў Кітаі тое самае трэба зрабіць з паўтара мільярдам. Таму нам, ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу, нават лягчэй, чым ім. І дадаў, што той крызіс у нас увогуле і не адчувальны, бо беларусы куды ездзілі, туды і ездзяць, на чым ездзілі, на тым і ездзяць, і нават не пахудзелі. Пад сто дваццаць кілаграмаў маюць. Засталося толькі зрабіць так, каб яны жылі як у Кітаі.

Хіба што нават беларускае кіраўніцтва ўжо зразумела, што наша „ўласная ўнікальная мадэль эканамічнага развіцця" не паддаецца ні рэфармаванню, ні перабудове. А як нейкая форма эканамічнага парадокса яна доўга пратрымацца таксама не зможа. Таму хіба і робіцца прапаганда на новае разуменне зямнога дабрабыту. Зусім няданна, у прапагандзе ўсё таго ж беларускага кіраўніцтва, гэта быў СССР. Цяпер будзем імкнуцца да ўзроўню жыцця кітайцаў. Тым больш, што „культурная рэвалюцыя", якая нанесла па беларускай культуры касмічны па сваіх маштабах і атамны па сіле ўдар, у нас ужо адбылася.

Віктар САЗОНАЎ

Абаронцы роднай культуры

Праз момант я ўявіла сабе, што прыязджаю ў Беласток з далёкага горада і, звычкай прыезджых, шукаю аб'явы пра культурнае жыццё горада. Мяне здзіўляе прысутнасць тут плакатаў з кірыліцай. Аб'явы пра беларускія канцэрты. Праз момант я здзіўляюся: адкуль яны тут? Адказ прыходзіць сам з сябе: я ведаю, што Беласток непадалёк Беларусі. Значыць, у нас справа з класічным памежжам. І мне цікава пазнаёміцца з гэтай адметнасцю, параўнаць горад з іншымі, пабачыць яго ў гістарычным і этнічным кантэксце.

Такія нахлынулі на мяне думкі ля слупа з культурнымі афішамі побач кінатэатра „Сырэна". На ім я пабачыла аж чатыры аб'явы пра культурныя беларускія мерапрыемствы. Ого-го! Прытым, плакат „Бардаўскай восені" і „Беларускага Трыялогу" ярка вылучаліся сваёй мастацкасцю і прафесіяналізмам. Гэта само па сабе паказвае, з якім мастацтвам у нас справа, якія ў нас узроўні (на слупе былі яшчэ афішы: „Ogólnopolski festiwal Piosenka Białoruska 2009 — 40 edycja — Koncert galowy" і „Białoruska Zabawa w Klubie EXIT, wstęp 10 zł". Але не пра багацце і экспансію беларушчыны будзе тут мова.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Калі думаю пра беларускі культурны рух на Беласточчыне ў міжваенны час XX стагоддзя, мне чамусьці заўсёды ўспамінаюцца плакты гэтага часу. Уражваюць яны саматужным стылем, аматарствам у добрым сэнсе. Мне нават не перашкаджаюць арфаграфічныя ці стылістычныя памылкі, бо важная тут ідэя. Ідэя, над якой прыстойны чалавек не сумняваецца. Плакат ці афіша заўсёды папулярызавалі не толькі канкрэтныя імпрэзы; іх адначасова можна адчытваць як культурны код. Чалавек глядзіць на саматужны плакат 1930-х гадоў, на якім пішуць пра спектакль у нейкай вясковай стадоле і адчувае гонар за тых аніматараў культуры, якія, нягледзячы на недахоп сродкаў, робяць справу і адначасова папулярызуюць родную мову. Яна тут прыярытэтная, вызначальнік нацыянальнай адметнасці, грамадскай спеласці. Мы адчуваем, што маем дачыненне да сапраўдных інтэлігентаў і абаронцаў роднай мовы.

Зусім іншыя налятаюць думкі, калі гляджу на плакаты Беларускага грамадска-культурнага таварыства ці агранізацыі-дачкі: Таварыства беларускай культуры. Гадамі згаданыя аніматары цягнуць у супраціўны кірунак. Значыць, усе свае плакаты і афішы пішуць выключна на польскай мове. Чалавек глядзіць і не ведае што думаць. Што гэта такое? Хітрасць? А можа прафанацыя знікаючай, як

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

снег вясной, беларускай мовы.

Я ў прынцыпе за двухмоўнымі афішамі і інфармацыяй у такіх гарадах як Беласток (многа беларусаў не ведае сваёй мовы, намі цікавяцца таксама іншыя). Але плакаты беларускага культурнага таварыства без беларускай мовы — гэта занадта ўжо падазрона! І гэта ў час, калі ў гмінах і вёсках пайшоў працэс увядзення двухмоўя і двухмоўных указальнікаў. У час, калі ўжо простыя людзі з вёскі гавораць пра патрэбу захавання мовы дзядоў і прадзедаў. Але, як вядома, у гэтай справе БГКТ ад пачатку не піснула словам, быццам сачыла з-за вугла і глядзела што здарыцца. А яно ўжо здарылася...

Ганна КАНДРАЦЮК

Вачыма еўрапейца

Таямнічыя прадказанні

У час свайго першага побыту ў Беластоку пасля чэрвеньскага назначэння на пасаду міністра культуры Беларусі, былы амбасадар РБ у Варшаве Павел Латушка заявіў:

— Вельмі важна, каб мы падпісалі двухбаковы пратакол аб культурным супрацоўніцтве, які б меў сістэмны характар і ахопліваў супрацоўніцтва нацыянальных бібліятэк і музеяў, вядучых тэатраў і кінематографа. Спадзяюся, што скора польскі міністр культуры прыме маё запрашэнне і наведае Мінск з рабочым візітам. Наколькі мне вядома, у постсавецкі перыяд польскі міністр культуры не быў з візітам у Беларусі.

Гэтыя словы — з пункту гледжання журналіста часопіса беларусаў у Польшчы — прагучалі цікава і шматабяцаюча. Я сам калісь задумваўся, чаму няма (фактычна яны неактуальныя) нейкай сістэмнай менавіта дамовы паміж Польшчай і Беларуссю наконт культуры, здавалася б даволі нейтральнай у палітычным вымярэнні. Тады яшчэ Польшча і іншыя еўрасаюзныя краіны ўзвялі шчыльны бар'ер у адносінах з Беларуссю. Акурат на авансцэну выйшла пытанне маёмасці Радзівілаў у Беларусі, у тым ліку калекцый у іх былых замках у Магілёве, Слоніме ці Віцебску. Разважаў я, чаму б не паказаць у Польшчы прадстаўнічай хаця часткі беларускай радзівілаўскай калекцыі, і то ў пачэсным месцы, напрыклад, у варшаўскім Нацыянальным музеі. Адна мая знаёмая, сусветнай вядомасці спецыялістка ў галіне мастацтва, патлумачыла тады мне:

— А як гэта сабе ўяўляеш? Калі б гэта мела адбыцца ў Нацыянальным музеі, тады неабходна было б прыдаць гэтай прэзентацыі адпаведны ранг, мабыць, з запрашэннем самога Лукашэнкі. А яму забаронены ўезд у Еўрасаюз.

Цягам апошніх двух гадоў крыху змянілася; памягчала стаўленне да афіцыйнай Беларусі і яе вядучых палітыкаў. Таму вось асабліва ўзрадавала мяне дэкларацыя міністра Латушкі. Пачуўшы ягоныя выказаныя ў Беластоку словы, я стрымгалоў пазваніў у Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны ў Варшаве. Цікавіла мяне, ці міністр Багдан Здраеўскі прыме запрашэнне паехаць з візітам у Мінск, якія тэмы будуць закрануты ў яе ходзе і ці ёсць шансы падпісання згаданага беларускім міністрам пратакола. Міністэрства было разгублена. Спярша з яго Інфармацыйнага цэнтра паявіўся адказ: „Зараз няма ў нас пацверджаных інфармацый наконт афіцыйнага візіту пана міністра ў Беларусь". Неўзабаве на мой адрас паступіў мэйл ад пані Іаланты Міцэль-То з Дэпартамента замежнага супрацоўніцтва МКіНС. Заспетая знянацку прасіла мяне расказаць нешта больш пра візіт і выказванні міністра Латушкі. Пазваніў я ёй і расказаў усё, што на гэты конт ведаў. У адказ пачуў, што варшаўскае міністэрства не атрымала ніякага запрашэння кранаючага магчымы мінскі візіт кіраўніка ейнага ведамства. Калі б у нейкай форме такая сустрэча абодвух міністраў адбылася, дык магла б яна кранаць агульны характар двухбаковых адносін і ладжання ў Беларусі Шапэнаўскага года. Адносна пратакола аб супрацоўніцтве дзяржаўных культурных устаноў, дык пакуль нічога пра гэта невядома, а падрыхтоўка да яго падпісання доўжылася б (пані Міцэль-То мяркуе, што каля паловы года) і той фрагмент выказвання міністра Латушкі трэба ўспрымаць не больш чым намер. І не ведаю, што на гэты конт меркаваць. Тым болей, што такія важныя словы міністр Латушка выказаў у час неафіцыйнага візіту, значыць, не па запрашэнні польскага ўрада, але Беларускага грамадска-культурнага таварыства.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Віншуем славутыя „Васілёчкі”

Аляксей МАРОЗ

У гэтым годзе мінае 45 гадоў дзейнасці славутага Хору песні і танца „Васілёчкі”, які расслаўляе на Беласточчыне і па-за яе межамі нашу беларускую песню, культуру і свой родны Бельск-Падляшскі. Хаця харысты ў асноўным выводзіліся з вёсак Бельшчыны, зжыліся ўжо са сваім горадам і домам культуры, у якім спатыкаюцца амаль ад самага пачатку. Праз „Васілёчкі” правінуліся сотні людзей, якія сваю любоў да спеву і музычныя ўмеласці аддалі агульнай справе, супольнаму спяванню ў грамадзе. У час сваёй дзейнасці хор даў каля 900 канцэртаў у Польшчы і за яе межамі.

— Як стваралася „Васілёчкі”, я ўжо замужам была. Прыйшла да мяне сяброўка Анна Радзіванюк і кажа: „Знаеш, Дуська, што ў Таварыстве (БГКТ — А. М.) хор арганізуецца? Як прыйдзеш да мяне, то пойдзем даведацца дакладней”. Мы яшчэ зайшлі да Адамюковай, а яна якраз валасы перад печкай сушыла. Забеглі да Анны Кобус і ў чатырох падаліся ў Таварыства, якое знаходзілася тады ў невялічкім будынку па вуліцы Міцкевіча, якраз насупраць „Падлясянкі”. Сядзелі там, між іншым, старшыня нашага аддзела Таварыства Уладзімір Раеўскі, інструктар Ян Шурбак і ўсіх нас запісалі да новаствоpанага калектыву, — пачынае расказ Еўдакія Навакоўская, якая ў хоры спявала ажно 40 гадоў. — Тады я скантактавалася са сваёй сястрой Аннай Кубай, што жыла ў Відаве, а Нюра Радзіванюк дала знаць у Пасынкі, да Уладзіміра Весялоўскага. Сабралася тады 5-7 чалавек і першыя спеўкі адбыліся яшчэ ў лістападзе і снежні 1963 года. Спявалі мы песні, якія ўмелі, але хутка падаслалі нам маладога дырыжора з Градалёў Аляксандра Лукашука і мы сталі супольна праводзіць рэпетыцыі ажно да каталіцкага Божага Нараджэння. Больш людзей сабралася на спеўцы, можа чалавек 15, адразу пасля нашага Ражджаства. Сам Уладзімір Весялоўскі асоб пяць прывёз з Пасынак на сваім матацыкле з каляскай. Я таксама прывяла ў хор сваіх знаёмых, якія раней спявалі ў іншым бельскім хоры. На спеўкі стала прыходзіць па 20-25 чалавек і з гэтага моманту (з 1964 года — А. М.) мы сталі рэгулярна сустракацца і лічыць стварэнне нашага хору.

— Я па два разы абарочваў матацыклам з Пасынак у Бельск, каб прывезці ахвотных спяваць у хоры, а зімой мы пяшком хадзілі на рэпетыцыі. Я любіў беларускую мову, песню. Ведаў таксама, дзе знаходзіцца БГКТ, і ў „Ніву” артыкулы пісаў, як карэспандэнт, — заяўляе Уладзімір Весялоўскі, які ад самага пачатку, з перапынкам, спявае ажно па сённяшні дзень. — Восем гадоў я не спяваў у хоры, але гэта было па прафесійных прычынах. Проста, я паехаў працаваць на Украіну і мяне не было тады ў Бельску.

Пасля некалькіх гадоў дырыжорам перастаў быць Аляксандр Лукашук, а яго месца заняў Сцяпан Копа з Маліннік, які ў час канцэртаў сам іграў на акардэоне.

— Хаця мы таксама спявалі песні па-руску, па-ўкраінску і на польскай мове, то найбольш было ў нас беларускіх песень. Першыя нашы выступленні былі ў Райках, у Бельскім доме культуры, у нашым кінатэатры і на фэсце ў Орлі. Выступалі таксама на першамайскіх і іншых урачыстасцях. Раней не было конкурсу „Беларуская песня” і мы выступалі на аглядах „Савецкай песні”, — кажа спадарыня Еўдакія Навакоўская.

Спачатку харысты спатыкаліся на рэпетыцыях у Бельскім аддзеле БГКТ, а пасля сталі сустракацца ў малой зале Бельскага дома культуры. Так і асталіся пры доме культуры ажно па сённяшні дзень, хаця нейкі час праводзілі рэпетыцыі ў бельскай ратушы. Трэцім дырыжорам бельскага хору стаў Юрый Шурбак.

У першых гадах дзейнасці ў хоры, які пазней назваў сябе „Васілёчкамі”, спявала чалавек за 20

— Калі Юрый Шурбак стаў свяшчэннікам, атрымаў прыход у Пасынках і трэба было нам шукаць новага дырыжора. Стаў ім Міхал Артышэвіч з Кляшчэль. Калі дырыжоры адыходзілі ад нас, не пакідалі нас самім сабе, але шукалі іншых асоб, якія хацелі б займацца з намі, — гаворыць спадарыня Навакоўская. — Калі намі стаў кіраваць Сяргей Лукашук (сённяшні дырэктар БДК — А. М.), мы сталі ездзіць на конкурсы „Беларуская песня”. Многа артыкулаў пра нас змяшчалі ў „Ніве”. Мы любілі „Ніву”, выпісвалі яе, куплялі ў кіёсках і таму ў мяне стварыўся архіў ніўскіх артыкулаў пра „Васілёчкі”.

У 1973 годзе хор прыняў назву „Васілёчкі”.

— У зборніку песень Куліковіча, выдадзеным у ЗША, я знайшоў твор „Васілёчкі-хабры” і апрацаваў яго на 4 галасы. На адной з рэпетыцый рашылі мы назваць хор загалоўкам гэтай песні. Пасля мы супольна працавалі над папулярызацыяй нашага названня „Васілёчкі”, — кажа дырэктар Бельскага дома культуры Сяргей Лукашук, які найдаўжэй быў дырыжорам „Васілёчкаў”, бо ў 1970-1990 гадах, а да 1970 года праз тры гады састаўляў акампанемент для калектыву. — Калі я кіраваў хорам, было ў ім нават больш за сорак асоб, а ў гэтым ліку па 7-8 чалавек іграла на інструментах. Акампанемент састаўлялі 2 акардэоны, флейта, карнет, гітара і бубен. Памятаю, як першы раз выступілі мы на II конкурсе „Беларускай песні” і пасля ўжо штогод прымалі ў ім удзел. Адносна часта мы выязджалі на Беларусь, а Мінскае тэлебачанне запісала саракахвілінную праграму пра наш хор.

У сямідзесятых гадах стала хадзіць на рэпетыцыі і выступаць з хорам Ірэна Астапчук, якая спявае ў „Васілёчках” па сённяшні дзень.

— Мяне дачка падгаварыла запісацца на хор, бо раней спявала ў белліцэі пад кірункам нашага дырыжора Сяргея Лукашука. Я рада, што спяваю ў „Васілёчках”. З песняй жыццё праходзіць лягчэй, весялей і жывецца даўжэй. Хаця дома былі работа і праблемы, але рэпетыцыі і выезды з хорам мабілізавалі і я крыху забывалася аб цяжкасцях, — гаворыць спадарыня Ірэна Астапчук. — У нас было многа дырыжораў і ўсе стараліся навучыць нас як найлепш спяваць. Калі кожны з іх адыходзіў, я вельмі турбавалася з-за гэтай падзеі, а пасля ж трэба было прыстасавацца да стылю кіравання чарговага дырыжора.

Чарговымі дырыжорамі „Васілёчкаў” былі Аліна Негярэвіч, Уладзімір Сахарчук, Мікола Мяжэнны, а зараз хорам кіруе Мікола Фадзін з Гродна. „Васілёчкі” часта перамагалі на цэнтральных элімінацыях конкурсу, а пасля фестывалю „Беларуская песня” ахвотна выступалі на іншых вялікіх беларускіх мерапрыемствах і шматлікіх фэстах. За шматгадовую дзейнасць у карысць культуры хор атрымаў Залатую адзнаку „Заслужаны Беласточчыне”, фінансавую ўзнагароду Міністра культуры і нацыянальнай спадчыны, узнагароды бурмістра Бельска і іншыя шматлікія вылучэнні. Хор мусіў справіцца таксама з адказнымі задачамі — выступаў у час рэалізацыі некалькіх фільмаў.

— Хаця ў „Васілёчках” паяўляліся цяжкасці з акампанементам і часта мяняліся дырыжоры, гэты хор умеў пераадолець складанасці і спяваў на высокім узроўні. Зараз „Васілёчкі” — вельмі добры хор, — заявіў нядаўна інструктар ВААК Сцяпан Копа, таксама былы дырыжор калектыву. Удакладніў ён, што назва „хор песні і танца” бельскія спевакі прынялі яшчэ ў пачатку сваёй дзейнасці і хаця былі спачатку прымеркі да танцаў, хор з танцамі не выступаў, толькі маглі яны паявіцца ў час прэзентацыі абрадных сцэнак. Зараз у „Васілёчках” спявае 15 жанчын і 8 мужчын. Сённяшні кіраўнік хору Ніна Бялецкая спявае ў ім з 1987 года, а кіруе з 1991 года.

— Я вельмі люблю спяваць і многа разоў трэба было сямейныя мерапрыемствы і асабістыя справы так арганізаваць, каб можна было рэгулярна сустракацца на рэпетыцыях і выязджаць з хорам. Перамогі на конкурсах падбадзёрвалі да далейшай працы ў карысць калектыву. Наш хор многа разоў выязджаў на Беларусь, быў, між іншым, у Мінску, Віцебску, Гродне, Маладзечне і Смаргоні. Калі летам арганізаваліся фэсты, мы практычна ніводнай суботы і нядзелі не сядзелі дома, толькі ўсё на розныя мерапрыемствы ездзілі, — кажа кіраўнік Ніна Бялецкая.

Зараз хор „Васілёчкі” спявае ў асноўным песні на беларускай літаратурнай мове. Яго рэпертуар складаюць апрацаваныя народныя песні і творы сучасных кампазітараў.

— Апрача выступаў з беларускімі песнямі мы рыхтавалі таксама абрады — „Сваты”, „Прыданне”, „Пераховіны”, „Хрысціны”, „Перапяліцу”, спявалі калядкі на калядных аглядах, — расказвае спадарыня Ніна Бялецкая. — Апошнім часам мы атрымалі адзнаку „Заслужаны для культуры” і Бронзавы крыж заслугі. Аднак мы турбуемся, бо маладых цяжка прыцягнуць у хор. Калі былі малодшыя, то замуж выходзілі, на адукацыю выязджалі і адыходзілі з хору. Мы былі б рады, калі б да нас прыйшлі маладыя. Таленавітыя людзі не павінны зачыняцца ў хаце, толькі павінны паказаць свае ўмеласці іншым людзям. Дзверы ў наш хор адкрытыя для ўсіх маладых.

Карыстаючыся нагодай кіраўнік „Васілёчкаў” спадарыня Ніна Бялецкая запрашае аматараў беларускай песні і музыкі на юбілейны канцэрт, прымеркаваны да 45-годдзя дзейнасці хору, які адбудзецца 14 лістапада ў 17 гадзін у Бельскім доме культуры.

Не толькі ветлівасць...

У вёсцы Чаромха працуе прадукто-ва-мясная крама „Крісмар". Варта адзначыць, што крама прапануе багаты асартымент тавараў. Паколькі змяшчаецца яна пры краёвай дарозе Беласток — пагранпераход Полаўцы-Пяшчатка, дык карыстаецца значным зацікаўленнем беларускіх пакупнікоў. Ветлівая абслуга, даступныя цэны прыцягваюць замежных гасцей. Прадпрымальнік задбаў не толькі аб належнае забеспячэнне, але і пра „разрыўку". Тут устаноўлены „аднарукі бандыт" (аўтамат для азартнай гульні ў грошы), дзе можна выйграць або „праваліць" даволі вялікія сумы (з-за такіх апаратаў учыніўся ўрадавы скандал, у якім паляцелі галовы некалькіх міністраў). Прадавец сказаў, што ў гэтым памяшканні „пракацілася" не адна машына (прайгралі, значыцца). Абслуга, як на вясковую краму, акуратна ставіцца да кліента. Параіць выбраць тавар, дапаможа старэчам паднесці кошык з пакупкай да прылаўка. Мне нават дапамаглі пагрузіць пакеты на ровар. Але апрача ветлівасці і загану я прыкмеціў. Здараецца, што прадаюць мясныя вырабы пасля тэрміну прыгоднасці. Такое мне трапілася 6 кастрычніка. На мой закід прадавец рэкамендаваў адмовіцца ад каўбаскі, але паводле вагі пакет мне падыходзіў і я гэты тавар узяў. Праўда, загадчыца панізіла цану на 19 грошаў за кілаграм. У хаце я зразу каўбаску „зрасходаваў". Калі я наведаў краму тры дні пазней, дык прыкмеціў, што на вітрыне залежваўся яшчэ пакет каўбаскі з пратэрмінаванай датай прыгоднасці. Параіў я затым прадаўцу зняць яго з вітрыны, бо такога тавару паводле закону нельга прадаваць.

Вырашэнне конкурсу

Павятовае аддзяленне КРУС супольна з Павятовай пажарнай камендатурай, Павятовым старостам у Гайнаўцы і Управай гміны ў Чаромсе арганізавалі конкурс „Здароўе і бяспечнасць працы ў сельскай гаспадарцы — 2009 г." Мэтай конкурсу было пашырэнне ў коле сялян прынцыпаў бяспечнай працы ў гаспадарцы. Удзельнічала чатырнаццаць асоб з тэрыторыі гміны. У чэрвені камісія наведала гаспадаркі. У выніку выяўлена было 111 заган, якія стваралі пагрозу ўзнікнення выпадкаў у час працы. На месцы высветлена, якім чынам іх ліквідаваць. Паўторная праверка адбылася ў верасні. Камісія пацвердзіла ўстараненне сарака шасці заган (начэплены былі покрывы на сельгасмашыны, рамантавана электраправодка, гаспадаркі забяспечаны належнымі драбінамі і сродкамі асабістай аховы). Камісія цікавілася не толькі бяспекай працы, але і глядзела за эстэтыкай і парадкам на сядзібе. Выкананне задач можна было паглядзець у час мультымедыйнай прэзентацыі, падрыхтаванай старшым інспектарам КРУС Яўгеніяй Маліноўскай. Перамаглі найлепшыя гаспадаркі. Першае месца ўзяло сужонства Крыстына і Мар'ян Качмажыкі з Янцэвіч. За імі чарговыя месцы занялі Барбара і Пятро Ясюкевічы з Апакі-Вялікай, Аляксей Ваўранюк з Апакі, Крыстына і Яўген Дудалі з Чаромхі-Вёскі, Мікалай Лягеза і Марк Алексяюк з Зубачоў. Узнагароды былі ўстаноўлены арганізатарамі. Незалежна ад таго ўсе ўдзельнікі конкурсу атрымалі засцерагальныя прадметы закупленыя з прафілактычнага фонду КРУС.

Уладзімір СІДАРУК

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Узнагароджаныя за закрытымі дзвярыма

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка, пабываючы на Беласточчыне, 25 кастрычніка наведаў Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы, размаўляў там пра магчымасці дапамогі яго ведамства і іншых устаноў РБ для беларусаў Гайнаўшчыны і ўручыў бурмістру Гайнаўкі Анатолю Ахрыцюку і дырэктару Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы і шматгадоваму раднаму ад БНВК Яўгену Сачко нагрудны знак Міністэрства культуры „За ўклад у развіццё культуры Беларусі". Аднак уручэнне ўзнагарод, на жаль, адбылося на закрытай для мас-медыяў і мясцовага грамадства сустрэчы. Не ўпусцілі на яе нават заслужаных будаўнікоў Гайнаўскага музея — былога шматгадовага намесніка старшыні Камітэта пабудовы музея, а пазней старшыню Музея і асяродка беларускай культуры Яна Хіліманюка, шматгадовага музейнага бухгалтара Аляксандра Харкевіча, а таксама Аляксея Харкевіча, які дапамагаў будаваць музей ад самога пачатку, а яшчэ і зараз часта яго наведвае, каб дапамагчы ў патрэбе. Мне сказалі, што спатканне закрытае для мас-медыяў, не патлумачыўшы прычыны такога рашэння.

Міністр культуры РБ Павел Латушка ўручыў нагрудны знак бурмістру Гайнаўкі Анатолю Ахрыцюку (справа) і дырэктару Гайнаўскага белліцэя Яўгену Сачко

Самая ідэя закрытых сустрэч зразумелая, бо не ўсе справы, якія разглядаюцца ў рабочым парадку, можна падаваць да агульнага ведама. Аб некаторых размовах магла б даведацца канкурэнцыя і перашкодзіць у рэалізацыі абмяркоўваных задум. Але чаму ж уручаць узнагароды за закрытымі дзвярыма, калі ўрачыстасць магла б адбыцца раней, у прысутнасці ўсіх сабраных? Атрымаць такія прэстыжныя ўзнагароды як нагрудныя знакі „За ўклад у развіццё культуры Беларусі", прысвоеныя Анатолю Ахрыцюку і Яўгену Сачко, гэта ж справа гонару і вельмі станоўчы прыклад іншым. Менавіта на ўручэнне такіх прэстыжных узнагарод добра было б загадзя запрашаць прадстаўнікоў мас-медыяў. Тады грамадства, у карысць якога працуюць вылучаныя асобы, мае магчымасць праз пасрэдніцтва тэлебачання, радыё і прэсы даведацца аб станоўчых дзеяннях узнагароджаных. Уручэнне нагрудных знакаў у час, калі журналіст чакае на музейным калідоры і не мае магчымасці ўвайсці на спатканне, каб зрабіць здымак у час узнагароджвання, гэта своеасаблівая практыка.

Сустрэча ў музеі распачалася з цёплых слоў і віншаванняў, з якімі бурмістр Анатоль Ахрыцюк прывітаў міністра Паўла Латушку, які і раней, будучы дыпламатам, дапамагаў гайнавянам у галіне культуры. Цяпер першы раз прыехаў ён на Гайнаўшчыну ў якасці міністра культуры і разам з гайнавянамі паглядзеў папоўненыя музейныя экспазіцыі і новыя выстаўкі, а толькі пасля адбылося закрытае спатканне.

— Ты, Мароз, не пытайся, што я думаю, не ўвайшоўшы на сустрэчу, бо магу знервавацца і нагаварыць такое, чаго пасля сам буду шкадавацца, — заявіў усхваляваны былы старшыня Музея і асяродка беларускай культуры Ян Хіліманюк у чаканні канца закрытага спаткання.

Спачатку ў Гайнаўцы меркавалася, што гэта нехта з мясцовых рашыўся ўчыніць частку спаткання закрытай для масмедыяў, але пасля бурмістр Анатоль Ахрыцюк патлумачыў, што сустрэча была закрытай па просьбе беларускага боку. Даведаўся я таксама, што ранейшая сустрэча з міністрам Латушкам у Культурным цэнтры Беларусі ў Беластоку таксама была закрытай для журналістаў.

— Я была на спатканні з міністрам Паўлам Латушкам у КЦБ у Беластоку і сам міністр сказаў, што сустрэча закрытая для мас-медыяў, — заявіла журналістка Радыё „Рацыя" Анна Шайкоўская.

— Я не магу зразумець, чаму спатканні міністра Паўла Латушкі з грамадствам робяцца закрытымі для мас-медыяў. Не бачу ніякай логікі ў такіх дзеяннях, — заявіў Канстанцін Бандарук, таксама з Радыё „Рацыя".

Асоба, якая ўдзельнічала ў закрытай сустрэчы ў Гайнаўцы, паінфармавала, што прадстаўнікі ўстаноў, якія працуюць на Гайнаўшчыне ў карысць беларускай культуры, расказвалі аб сваіх патрэбах і спадзяваннях. Звярталіся яны за дапамогай да міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі, а міністр гаварыў у чым можа дапамагчы. З расказаў прысутных на сустрэчы вядомым стала таксама, што ўручаючы нагрудны знак міністр Павел Латушка звярнуў увагу, між іншым, на ангажаванасць бурмістра Анатоля Ахрыцюка ў арганізаванне беларускіх мерапрыемстваў, прыгадаў пра дзве гайнаўскія вуліцы, названыя па ініцыятыве бурмістра імёнамі беларускіх пісьменнікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Перадаючы ўзнагароду Яўгену Сачко, міністр звярнуў увагу на яго паспяховае кіраванне Гайнаўскім белліцэем і ангажаванасць у працу на карысць беларускай культуры па-за школай. Дырэктар Яўген Сачко шмат гадоў з'яўляецца радным ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта і ад яго імя адзін тэрмін узначальваў Раду горада. Дабіўся адкрыцця і паспяховай дзейнасці белгімназіі і быў адным з галоўных ініцыятараў і каардынатарам прыняцця Радай горада пастановы аб увядзенні беларускай дапаможнай мовы для зносінаў мясцовага грамадства з чыноўнікамі. Быў таксама адным з ініцыятараў падрыхтоўкі пастановы аб двухмоўных указальніках на польскай і беларускай мовах (працы ў гэтай справе на даны момант спыніліся). Калі б абодва ўзнагароджаныя самаўрадавыя лідары больш рашуча ўключыліся ў ініцыятыву пад загалоўкам „назвы Гайнаўкі па-польску і па-беларуску на ўказальніках на акраінах горада", было б вельмі вялікае праўдападабенства паспяховага вырашэння гэтага пытання.

— Уручаны мне нагрудны знак я не ўспрымаю як асабістае вылучэнне. Лічу, што гэта ўзнагарода за дзейнасць у карысць беларускай культуры цэлага Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы і хаця б нашага беларускага калектыву „Знічка". Калі гаварыць пра маю працу ў Радзе горада, то самай вялікай узнагародай за яе з'яўляецца моцная падтрымка выбаршчыкаў для Беларуска-народнага выбарчага камітэта, — заявіў дырэктар Яўген Сачко. Звярнуўся ён да міністра культуры Паўла Латушкі з прапановай узяць патранат над музычным калектывам „Знічка".

— Звярнуўся я з просьбай да міністра культуры, каб дапамог „Знічцы" ў яе дзейнасці. Папрасіў таксама міністра дапамагчы сарганізаваць у чэрвені наступнага года экскурсію для ўсіх настаўнікаў нашага ліцэя ў Мінск, каб мы пабачылі там беларускія мерапрыемствы, пабывалі ў оперы і Тэатры Янкі Купалы, — дадаў дырэктар Сачко.

Пасля спаткання стала вядомым, што міністр Латушка падарыў Гайнаўскаму белліцэю тэлевізар маркі „Гарызонт", што хоча дапамагчы пашыць касцюмы калектыву „Знічка" і перадаць Беларускаму музею гукаўзмацняльную апаратуру. Міністр Павел Латушка паінфармаваў, што ў бліжэйшы час будуць абмяркоўвацца канкрэтныя пытанні дапамогі ўстаноў Рэспублікі Беларусь установам Гайнаўшчыны ў сферы культуры.

Ну і дагаварыліся!

Пабываючы ў іншамоўнай краіне, трэба зважаць на словы, якія самі выказваем ці пачуем, бо могуць яны мець цалкам іншае, як нам здаецца, значэнне. А тады — промах!

Аднойчы турыстка з польскай экскурсіі ўбачыла на дзвярах зачыненай крамы аб'яву, у якой сярод незразумелых слоў адно здавалася быць знаёмым: „dupa". Тады і спыталася ў экскурсавода, які ў той час паясняў астатнім:

— Там вось я прачытала такое слова... дупа. Што яно абазначае?

Экскурсавод, не спыняючы расповеду, коратка ўставіў: „пазней" і далей расказваў пра архітэктурныя асаблівасці старых камяніц з характэрнымі вочкамі буйвалаў на стрэхах. Праз нейкі час дзеўка пыўтарыла сваё пытанне. Акурат у хвіліну, калі экскурсія накіравалася на стары „жалезны мост ілгуноў". Паводле прытчы, калі стоячы на мосце нехта пачынае ілгаць — мост праваліцца. На гэты раз не толькі экскурсавод, але і некаторыя ўдзельнікі групы спынілі цікаўнасць дзеўкі кажучы „потым, пазней", маючы пэўна надзею, што пазней экскурсавод высветліць яе цікаўнасць. Бо сапраўды гісторыя жалезнага моста была цікавай.

— Аднойчы, — працягваў гід, — у Сібю (адзін з буйнейшых гарадоў Трансільваніі) завітаў з гаспадарчым візітам прэзідэнт краіны Нікалае Чаўшэску. Так гаварылі сведкі падзеі. Чаўшэску хадзіў па горадзе, сустракаў людзей на заводах, традыцыйна шмат абяцаў, але ніяк не хацеў прайсці цераз мост. Відаць, на сваім грэшным сумленні меў столькі грахоў, ілгунства, што пабаяўся рызыкнуць.

Наша цэлая экскурсія ўвайшла на мост, некаторыя парабілі здымкі і вярнуліся ў гатэль, дзе ўжо без эмоцый гід растлумачыў цікаўнай Моніцы, бо так называлася дзяўчына, што „дупа" па-румынску значыць: „потым", „пазней", або „паводле". У гэтым выпадку аб'ява на дзвярах крамы інфармавала, што „дадзенага тавару няма, але прывязуць яго пазней".

І так гэта бывае, што, здавалася б, слова нам знаёмае, аднак на іншай мове абазначае зусім што іншае. І „дупа" — не тое, аб чым мы падумалі.

Такіх, аднак, ляпсусаў бывае больш.

Румынская мова прылічваецца да сям'і раманскіх моў, такіх як французская, італьянская ці каталонская. Паводле граматыкі і семантыкі мае з імі найбольш супольнага. Але дзякуючы гісторыі і розным больш ці менш суседскім уплывам шмат слоў у румынскай мове мае славянскія карані. Вось, для прыкладу, румынскае „da" гэта па-нашаму „так", або „да" — па-руску. Іншыя словы крыху больш складаныя, але няцяжка іх зразумець. „Sticla" — гэта бутэлька, мабыць таму, што ад „стекло", „autogera" — аўтавакзал, так як у паўднёвых славян, „bolnav" — значыць „хворы".

Але ўжо „pierdut", хоць не мае славянскіх каранёў — можна ўцяміць яго значэнне. „Пердут" абазначае „згубіў", „страціў". І ад гэтага слова часта пачынаюцца аб'явы на дошках, скажам „Згубіў ключы..." і г.д.

Здавалася б, пачынаеш разумець, а тут ізноў парадокс! Калі румынскае „da" гэта нашае „так", але румынскае „nu" гэта нашае „не"! Хаця ў нас, калі хтосьці скажа „ну" — разумеецца гэта як „так". Хіба што „ну" прымяняем як тост, заахвочваючы да выпіўкі.

Падымаючы чарку гарэлкі (у румынскім варыянце можа гэта быць „horinka" на поўначы, „palinka" ў Трансільваніі, „tuica" (чыт.: цуйка) у Валахіі і ў гарах, ці „vodka" — паўсюдна), кажам свайму румынскаму сябру: „Ну!!" І што ён тады падумае?

Юрка ЛЯШЧЫНСКІ

Хвішчэй

Фота Кшыштофа ПАЖЫХА

Хвішчэй — такую дзівосную назву мае невялікі правы прыток ракі Лясной-Правай. Перагартаў я шмат прац, прысвечаных мясцовым назвам Белавежскай пушчы, і не знайшоў аніводнай, у якой давалася б тлумачэнне гэтай назвы. Даўжыня згаданай рэчкі каля 13 км. Пачынаецца яна на подступе да Белавежскай пушчы, у ваколіцы пасёлка Калонія Новае Беразова і ўпадае ў Лясную ў квартале 485. У літаратуры, асабліва той старэйшай, спатыкаецца яна пад назвамі Хвішча, Хвішчэ, Хвішчэя і Хвішчэн. Даўней рэчка знаходзілася ў Лесніцтвах стражы, потым вызначала мяжу паміж двума пушчанскімі надлясніцтвамі — Лясная і Старына. Зараз знаходзіцца на тэрыторыі надлясніцтва Гайнаўка.

Хвішчэй падмацоўваецца водамі некалькіх безыменных невялічкіх ручаёў і двух большых: Чобуток і Лазіца, якія ўпадуць у рэчку з правага боку.

Рэчка Хвішчэй зараз уваходзіць у састаў рыбацкай вобласці ракі Лясная № 1.

Непадалёку вёскі Арэшкава даліну рэчкі парастае багатая балотная расліннасць, у якой пражываюць водна-балотныя птушкі. Птушкалюбы могуць тут паназіраць за некалькімі дзесяткамі вельмі цікавых відаў .

У 1960-х гадах рэчка была рэгуляваная. Схамяніліся тады, што ў ваколіцы пачаўся працэс паступовага паніжэння ўзроўню грунтавых вод, які дадаткова паскорыла яшчэ меліярацыя лугоў і дрэнажаванне палёў. У 1980-х гадах пачалі занікаць багнавыя ачагі з характэрнай для іх аернай расліннасцю.

У 1991 годзе распачаліся дзеянні па паўторным павышэнні ўзроўню грунтавых вод. Даліну Хвішчэя ўзяло пад дзейсную рэстаўратарскую ахову Паўночнападляшскае таварыства аховы птушак. Артур Дамашэвіч у двухмесячніку „Chrońmy Przyrodę Ojczystą" (№ 2/1995) пісаў: „Тэрыторыя гэтая, калісьці меліяраваная, была поўнасцю рэнатуралізавана. Збудаванне вала ў некалькі соцень метраў стала прычынай рэгулявання ўзроўню вады, робячы немагчымым заліванне лугоў у ваколіцы, якія былі кошаны мясцовымі земляробамі. Пачало гнездавацца тут шмат рэдкіх і выміраючых відаў птушак, м.інш. белакрылая крачка і вяртлявая чаротаўка".

У 1991 годзе, распараджэннем беластоцкага ваяводы № 6/17 ад 7 жніўня 1997 года, участак даліны рэчкі Хвішчэй плошчай больш за 124 га быў ахоплены аховай у якасці экалагічнага ўжытку балотных экасістэм (зараз абшар гэты ўваходзіць у склад запаведніка Натуральныя лясы Белавежскай пушчы). У 1999 годзе Паўночнападляшскае таварыства аховы птушак узяло пад ахову лугі ў даліне Хвішчэя, ствараючы на іх тэрыторыі грамадскі запаведнік „Гарнянскія лугі". У 2004 годзе намечана тут дыдактычна-прыродазнаўчую сцежку (4 км); працягваецца яна паміж аўтобусным прыпынкам Старая Юдзянка і прыпынкам гарадскога транспарту па вуліцы Вжасовай у Гайнаўцы.

Праз даліну Хвішчэя пралягае „Шлях па слядах студзеньскага паўстання", намечаны ў выглядзе пятлі Гайнаўка — Арэшкава — Гайнаўка. Шлях даўжынёй у 31 км памечаны блакітным колерам. У даліне рэчкі знаходзіцца славуты, хаця ўжо засохлы (з пачатку 1980-х г.г.) „Цар-Дуб".

Пётр БАЙКО

Гайнаўка

Свята людзей з белай палачкай

10 кастрычніка г.г. у Гайнаўцы адбылося святкаванне з нагоды Дня белай палачкі. Урачыстасць арганізавала Павятовае праўленне гуртка Польскага саюза невідучых (ПСН) у Гайнаўцы. Сабралася 50 чалавек з Гайнаўкі ды з Белавежскай, Дубіцкай, Нарваўскай і Нараўчанскай гмін. На сцяне красавалася насценгазета з малюнкаў дзяцей з Прадшколля № 2 у Гайнаўцы пад загалоўкам „З жыцця людзей з белай палачкай", якія рысавалі іх пад кірункам Барбары Кісляк і Агнешкі Харытонаў.

У святкаванні ўдзельнічалі намеснік старосты Гайнаўскага павета Юрый Сірак, кіраўнік Павятовага цэнтра дапамогі сям'і Павел Шыманскі і дырэктарка Комплексу спецыяльных школ у Гайнаўцы Ірэна Зін.

Мерапрыемства вёў старшыня павятовага праўлення гуртка ПСН Януш Пух. Пасля адкрыцця ўрачыстасці і прывітання сабраных ён паінфармаваў, на якую дапамогу могуць разлічваць невідучыя з боку дзяржаўных устаноў ды пра навейшыя дапаможныя рэчы для людзей з белай палачкай, якія паявіліся на нашым рынку. З рознай электроннай апаратурай для невідучых, у тым ліку з г.зв. чытакамі ды павелічальнікамі знаёміў сакратар праўлення Мікалай Янкоўскі. Даваў ён і практычныя парады як карыстацца гэтымі дапаможнікамі і дзе можна атрымаць дафінансаванне да пакупкі м.інш. чытакаў ці кампактных тэлефонаў для невідучых з г.зв. дадатковымі функцыямі.

Яуш Пух уручыў прыгожыя дыпломы з падзякай за вялікую ангажаванасць у галіне дапамогі людзям невідучым або тым, якія вельмі слаба бачаць. Атрымалі іх Галіна Шыманская і Тэрэса Астроўская (члены праўлення гуртка), Мікалай Янкоўскі (сакратар) і Ян Целушэцкі (намеснік старшыні) ды Валянціна Дэмчук. Апрача дыпломаў былі і рэчавыя ўзнагароды для ўсіх членаў ПСН — спецыяльныя кашалёчкі-білонаўкі на 9 манет розных наміналаў і велічыні, ад 1 граша да 5 злотаў, у якіх на кожную манету ёсць сваё „гняздзечка".

З мастацкай праграмай выступілі вучні з Комплексу школ у Гайнаўцы. Быў салодкі пачастунак. Абслугоўвалі тры маладыя валанцёркі: Наталля Саха, Моніка Келбашэўская і Рэната Тушынская, а таксама актыўныя жанчыны-сімпатыкі арганізацыі невідучых — Валянціна Дэмчук, Галіна Мончка і Ядвіга Матыс. Пра такіх людзей, якія шчыра дапамагаюць іншым, так пісаў польскі паэт Адам Асык: „Для сэрцаў шляхетных найбольшай раскошай, калі іншым радасць у нядолі прыносяць".

Ян ЦЕЛУШЭЦКІ

ВІНШАВАННІ

Рэдакцыя „Нівы" сардэчна віншуе **Эльжбету і Дарафея Фіёнікаў** рупліўцаў беларускай справы на Бельшчыне з нараджэннем дачушкі **Таісы.** Няхай расце Вам на радасць у здароўі і шчасці

Рэдакцыя

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Сустрэча з настальгіяй

Хутка бяжыць час. Здаецца, пазаўчора сустракалі мы новае тысячагоддзе, а ўжо, бач ты, хутка і дзесяты год яго прычакаем.

Толькі што адшумеў-адзвінеў-адбегаўся яшчэ адзін мітуслівы дзень жыцця і пакінуў пасля сябе цішыню.

Іншы раз, калі застаемся мы самнасам з гэтаю звонкаю цішынёю, нячутна адчыняюцца дзверы і, мякка ступаючы кашэчымі лапкамі, прыходзіць у сэрца настальгія па ўчарашніх днях.

Прыходзіць яна і прыносіць з сабою ўспаміны аб днях дзяцінства, дзе купаліся мы ў празрыстых хвалях радасці. Рэхам у сэрцы адклікаюцца дні юнацтва, дзе сустрэліся ўпершыню з пунсовымі хвалямі ружаў першага кахання. Там, на ўчарашніх сцяжынках жыцця, віталіся мы іншы раз з апранутым у шэрыя лахманы часу гарбатым смуткам, а з-за вугла, наводмаш, біла да крыві на вуснах звар'яцелае гора.

... Круціць кола часу нябачная чараўніца-вавёрка. Змяняецца ўсё навокал, прыгажэе. Нібы ў той казцы, вырастаюць ля нас гмахі прыгожых будынкаў. Быццам тыя маладзіцы, што ўпрыгожылі вуліцы новымі банкамі ды магазінамі. І, пераганяючы вецер, імчаць ля іх прыгожыя аўтамабілі.

А вось ці змяніў час людзей? Ці прыгажэйшымі яны сталі? Прыгажэйшымі не вопраткаю, а душою?

Мо сталі людзі жыць з пачуццём большай павагі ды дабрыні адзін да другога? Меней, ці наадварот, болей, стала сярод іх эгаізму, скнарнасці ды злосці?

Адыходзіць у мінулае і моўчкі зачыняе за сабою настальгія брамку часу. Толькі па позірку яе прыгожых вачэй разумееш, што ў дні ўчарашнія чалавечнасць каштавала даражэй за багацце.

Пятро АКУЛІК

Пятро АКУЛІК

Конік з ляшчыны

Сад бялюткі на пышным дыване рамонкаў,
Буслоў клёкат над хатай разносіцца звонкі.
Сярод золата ранку блішчаць крышталёвыя росы,
А бярозы ў туманах-фіранках
Заплятаюць дзявочы косы.

На ваколіцы студня
Згубіла катосьці — гукае.
Мо дзяцінства маё,
Што ў дуброве зялёнай блукае.
Накалола ўжо босыя пяткі
І нішто — заліваецца смехам.
У сягодняшні дзень
Смех той звонкі
Даносіцца рэхам.

Асядлала каня з ляшчыны
І імчыць па знаёма-зялёных сцяжынках.
Пралятае дзяцінства ў жыцці
Як у цэлай гадзіне знікае хвілінка.

Вучні бельскай „тройкі" з настаўніцай беларускай мовы Валянцінай Бабулевіч

Мікалай Носаў

Жывы капялюш

Капялюш ляжаў на шафе, коцік Базыль сядзеў на падлозе ля шафы, а Уладзя і Вадзік сядзелі за сталом і расфарбоўвалі малюнкі. Раптам ззаду нешта пляснулася — упала на падлогу. Яны азірнуліся і ўбачылі на падлозе ля шафы капялюш.

Уладзя падышоў да шафы, нахіліўся, хацеў падняць капялюш — і раптам як закрычыць:

— Ай-яй! — і бягом убок.

— Чаго ты? — пытае Вадзік.

— Ён жы-жы-жывы!

— Хто жывы?

— Ка-ка-капялюш.

— Што ты, хіба ж капелюшы бываюць жывыя?

— Паглядзі сам!

Вадзік падышоў бліжэй і стаў глядзець на капялюш. Раптам капялюш папоўз проста на яго. Вадзік як закрычыць:

— Ай! — і скок на канапу. Уладзя за ім.

Капялюш вылез на сярэдзіну пакоя і спыніўся. Хлопцы глядзяць на яго і трасуцца ад жаху. Тут капялюш павярнуўся і папоўз да канапы.

— Ай! Вой! — закрычалі дзеці. Сасскочылі з канапы і бягом з пакоя. Прыбеглі на кухню і дзверы за сабой зачынілі.

— Я п-п-п-пайду! — кажа Уладзя.

— Куды?

— Пайду да сябе дадому.

— Чаму?

— Капелюша баюся. Я ўпершыню бачу, каб капялюш па пакоі хадзіў.

— А можа, яго хто-небудзь за вяровачку цягае?

— Дык схадзі паглядзі.

— Хадзем разам. Я вазьму клюшку. Калі ён да нас палезе, я яго клюшкай трэсну.

— Чакай, я таксама клюшку вазьму.

— Але ж у нас другой клюшкі няма.

— Тады я вазьму лыжны кіёк.

Яны ўзялі клюшку і лыжны кіёк, прачынілі дзверы і зазірнулі ў пакой.

— Дзе ж ён? — пытае Вадзік.

— Вунь там, ля стала.

— Зараз як трэсну яго клюшкай! — кажа Вадзік. — Хай толькі палезе бліжэй, валацуга такі.

Але капялюш ляжаў каля стала і не рухаўся.

— Ага, спалохаўся! — узрадаваліся хлопцы. — Баіцца лезці да нас.

— Зараз я спужаю яго, — сказаў Вадзік.

Ён пачаў грукаць па падлозе клюшкай і крычаць:

— Гэй, ты, капялюш! Але капялюш не рухаўся.

— Давай набяром бульбы і будзем у яго бульбай страляць, — прапанаваў Уладзя.

Яны вярнуліся на кухню, набралі з кошыка бульбы і пачалі ёю шпурляць у капялюш. Шпурлялі, шпурлялі, урэшце Вадзік пацэліў. Капялюш як падскочыць угару!

— Мяў! — закрычала нешта.

Бач, з-пад капелюша высунуўся шэры хвост, потым лапа, а потым і сам коцік выскачыў.

— Базылёк! — усцешыліся дзеці.

— Пэўна, ён сядзеў на падлозе, а капялюш на яго з шафы ўпаў, — здагадаўся Уладзя.

Вадзік ухапіў Базылька і давай яго абдымаць.

— Базылёк, міленькі, як жа ты пад капялюш трапіў?

Але Базылёк нічога не адказваў. Ён толькі фыркаў ды жмурыўся ад святла.

Чэслаў МІЛАШ

МАЯ ВЕРНАЯ МОВА

Мая верная мова,
служыў я табе,
штоночы стаўляў прад табою місачкі, поўныя колераў,
каб мела ты коніка з поля, бярозку й гіля,
захаваных у памяці мною.

Гэта доўжылася шмат гадоў.
Была бацькаўшчынаю маёй, бо другой не ставала.
І я думаў, што ты пасярэдніцай станеш таксама
паміж мной і людзьмі дабрыні,
хаця б іх было дваццаць ці дзесяць
альбо не нарадзіліся шчэ.

Прызнаюся цяпер у сумневах сваіх.
Надараюцца моманты, што мне здаецца, — жыцьцё
змарнаваў.
Бо ты мова зьняслаўленых,
неразумных, якія адно аднаго ненавідзяць,
можа, больш нават, як чужаніцаў,
ты даказьнікаў мова,
ты мова вар'ятаў,
хварбітоў на нявіннасьць сваю.

Але хто безь цябе я?
Шкаляр недзе ў краі далёкім,
а success, ані страху, ані прыніжэньняў.
Так, ды хто безь цябе я?
Філёзаф такі, як і кожны.

Разумею, гэта, пэўне, маё выхаваньне:
арэолу індывідуальнае славы пазбыты.
Грахаводніку з маралітэ
Вышні Збаўца дыван падсьцілае чырвоны,
а тым часам магічны ліхтар
абразы чалавечых і боскіх пакутаў усё кідае на палатно.

Мая верная мова,
можа, я менавіта павінен цябе ратаваць.
Так і буду далей прад табою стаўляць місачкі, поўныя колераў
і найсьветлых, і чыстых, як толькі магчыма,
бо ў няшчасьці патрэбныя нейкія лад ці краса.

Бэрклі, 1968

Пераклалі Юрась Бушлякоў і Андрэй Хадановіч

Карыцціскі

Наша падарожжа падляшскімі шляхамі прапаную надалей працягваць па Дубіцкай гміне. Гэтым разам запрашаю ў Карыцціскі.

Вёска была створана каля 1570 года пад назвай Корыцішча. У тыя часы каралеўскі прыдворны Астафій Халэцкі, у межах праводжанай на тэрыторыі Бельскіх уладанняў валочнай памеры, заснаваў некалькі вёсак, між іншым, Істок, Вітава, Махнатае, Мора і Карыцціскі. Да вёскі належалі 20 валок зямлі. Жыхары Карыцціскаў тлумачаць назву сваёй мясцовасці тым, што знаходзіцца яна непадалёк ад рэчышча (карыта старой ракі). Другое тлумачэнне — гэта месцазнаходжанне вёскі паміж рэчышчамі (карытамі) двух рэк.

Спачатку быў створаны праваслаўны прыход у Старым Беразове, пасля Карыцціскі ўвайшлі ў склад прыхода ў Старым Корніне.

У выніку войнаў і эпідэмій у сярэдзіне XVII стагоддзя Карыцціскі поўнасцю абязлюдзелі.

Некаторыя сялібы захавалі форму загароды падоўжанага тыпу бельска-гайнаўскага стылю, якому характэрна спалучэнне пад супольным дахам жылога дома і гаспадарчых пабудоў. Цікавым з'яўляецца факт, што даўжыня такой пабудовы магла расцягнуцца нават на сорак метраў. Хаты стаялі франтонам да вясковай дарогі.

Карыцціскі адметныя тым, што ў сярэдзіне вёскі знаходзіцца драўляны млын галандскага тыпу з 1948 года. Гэтаму тыпу ветраных млыноў характэрны нерухомы корпус, на якім замацавана рухомая частка з крыламі. Дзякуючы гэтаму было лягчэй павярнуць млын у напрамку ветру. Гэты тып адрозніваецца ад іншага, які можна ўбачыць на Падляшшы — ад казляковага млына, у якога рухомым з'яўляецца ўвесь корпус разам з механізмам унутры. Казляковы млын можна ўбачыць у Грабаўцы, непадалёк Дубіч-Царкоўных.

У міжваенны перыд у Карыцціскаў былі, праўдападобна, два млыны. Абодва былі разабраны пасля Другой сусветнай вайны.

Ветраны млын у Карыцціскаў складаецца з нерухомага корпуса, рухомай часткі з крыламі і з механізма ўсярэдзіне, які меле збожжа на муку. Корпус млына мае васьмібаковую форму (даўжыня кожнага боку 2 метры). Неад'емнай часткай млына з'яўляецца прыбудоўка з паўночнага боку. Агульная вышыня будынка — амаль 12 метраў. Млын складаецца з трох паверхаў. На пабудову млына было выкарыстана каля 30 кубаметраў драўніны.

Цікавінкай з'яўляецца факт, што першапачаткова млын не выкарыстоўваўся для памолу збожжа, не было нават механізмаў для гэтай мэты. Млын быў маторам для гаспадарчых прылад — малацілкі, сячкарні. Прыстасаванне для памолу збожжа было ўсталявана толькі пасля 1950 года.

Млын у Карыцціскаў працаваў да 1972 года.

Тэкст і фота Міхася СЦЕПАНЮКА

Музыка з кайфам

Роля героя

Калі помніце „Музыку з кайфам" з мінулага тыдня, то напэўна чакаеце другой часткі расказу аб Лявоне Вольскім, вакалісце ды лідары такіх гуртоў як „Н.Р.М.", „Крамбамбуля", „Зэт", а нават „Новае Неба", а таксама праектаў „Народны альбом" ці „Я нарадзіўся тут".

Лёня, Лёнік, Леон — так па-сяброўску называюць Лявона Вольскага розныя людзі, знаёмыя з ім даўжэй ці карацей, знаёмыя з Беларусі, Польшчы і многіх іншых краін свету, куды папаў Лявон або з гуртом „Н.Р.М.", або сам — як саліст. Важнасць яго для беларускай культуры даказаў апошні фестываль „Бардаўская восень", праведзены на Падляшшы. Зоркай сёлетняга фестывалю стаў гурт „Н.Р.М." у акустычным фармаце, але сам Лявон паявіўся перад добра вядомай яму гарадоцкай публікай, а таксама прабаваў падымаць з крэслаў публіку ў Студыі Рэмбрандт Радыё Беласток. Нёсся голас Лёні, дзякуючы інтэрнэту, на ўвесь свет. Але нясецца ён безупынна ўжо больш за дваццаць гадоў.

Лявон Вольскі — унук Віталя, пісьменніка; сын Артура, паэта. Кім мог стаць чалавек выхаваны ў такой літаратурнай сям'і? Не толькі голасам, а таксама і сумленнем Беларусі. Як „Сумленне" піша выдатныя тэксты, у якіх шмат іроніі, праблем, апрануты у шматлікія метафары і параўнанні. Ён спасылаецца на сімвалы сучаснасці і мінуўшчыны і таму з'яўляецца так важным героем сучаснай беларускай культуры. Ён — чалавек-установа, як кажуць, „майстар на ўсе рукі": піша, іграе, спявае. Чалавек даволі сціплы, які раскрываецца ў мастацкім плане. Так, гэта не толькі герой моладзі, але сапраўдны мастак. Лёня гэта, проста, мастацкае імя; дастаткова глянуць на нашага Лёніка Тарасэвіча, які, дарэчы, з Вольскім сябруе. Наш беларускі культурны свет развіваецца дзякуючы адважным, таленавітым і бескампрамісным ільвам. Але, як піша сам

Лявон Вольскі ў адной са сваіх песень: „Роля героя, цяжкая доля".

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 45

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 41:

Жыццё, пуп, аматар, Шчара, чараўніца, чытанка, так, агонь, чоп, дужы, голас. Маг, шчыт, пачатак, марак, баран, таўкач, нагода, цар, опус, ён, пальчык.

Узнагароды, новы зборнік вершаў Віктара Шведа „Смяшынкі", выйгралі **Эвеліна Самасюк, Данель Гуральчук, Патрыцыя Скарбіловіч, Віялета Дработа, Юліта Данільчук** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!



Пра беларусаў у Літве

Размова з Лілеяй Плыгаўкай, дацэнтам Віленскага педагагічнага інстытута

— ***Колькі нацыянальных меншасцей пражывае ў Літве?***

— На сучаснай культурна-этнічнай карце Літоўскай Рэспублікі пражываюць прадстаўнікі 105 нацыянальнасцей. Да найбольш значных нацыянальных груп пасля літоўцаў у колькасным плане адносяцца рускія, палякі, беларусы і ўкраінцы. Беларускі даследчык беларуска-польска-літоўскага памежжа Мікалай Бяспамятных асаблівасцю этнасацыяльнай структуры Літвы лічыць, па-першае, тое, што „этнакультурныя меншасці дастаткова кампактна засяроджаны ў яе паўднёва-ўсходняй частцы, якая далучаецца да дзяржаўнай мяжы Літвы з Польшчаю і Беларуссю (Віленскі край), і, па-другое, тое, што гэтыя супольнасці з'яўляюцца дыяспарамі вялікіх нацый, што валодаюць дзяржаўным суверэнітэтам". У межах Літоўскай Рэспублікі вылучаецца вось яе паўднёва-ўсходняя частка — Віленскі край — унікальны мультыкультурны рэгіён, дзе стагоддзямі кампактна побач жывуць прадстаўнікі розных этнасаў і якія падчас свайго фарміравання і развіцця зведалі пэўныя ўзаемаўплывы культурных традыцый і каштоўнасцей. Гістарычнае суіснаванне розных народаў і цеснае перапляценне іх культур абумовіла інтэнсіўныя і разнастайныя лінгвістычныя кантакты і стала натуральнай школай этнакультурнай цярпімасці, традыцыйна характэрнай гэтаму рэгіёну. Паўднёвы ўсход Літоўскай Рэспублікі як аб'ект навуковай увагі цікавы не толькі ў аспекце гістарычных працэсаў нацыянальна-культурнай і моўнай інтэграцыі, але і актуальных культуралагічных і лінгвістычных праблем. Найбольш яскрава культурныя традыцыі розных народаў пераплецены ў сталіцы Літоўскай Рэспублікі — Вільні, дзе значную частку складае славянскае насельніцтва: палякі — 101 526 тыс., рускія — 75 850 тыс., беларусы — 21 484 тыс., украінцы — 7 012 тыс.

— ***Ці спецыфіка полікультурнай тэрыторыі значна ўплывае на ўзаемаадносіны людзей?***

— Яна значна ўплывае на ўзаемаадносіны людзей у культурнай, бытавой, палітычнай і эканамічнай сферах, што прыводзіць да стыхійнага і несвядомага праяўлення, у першую чаргу, у маўленчай практыцы спецыфічных рыс не сваёй нацыянальнасці, а таксама да складанасці і неадназначнасці ў вызначэнні ўласнага нацыянальна-культурнага ідэнтытэту.

— ***Вы вялі даследаванні на студэнтах. Кім яны сябе ўсведамляюць?***

— Вынікі даследавання, праведзенага мною з 85 студэнтамі розных нацыянальнасцей факультэта славістыкі Віленскага педагагічнага ўніверсітэта, паказалі, што рэспандэнты, якія паходзяць з монаэтнічных сем'яў, лягчэй усведамляюць сваю нацыянальную прыналежнасць і ідэнтыфікуюць сябе: літоўцамі — 14, палякамі — 14, рускімі — 3, беларусамі — 4, украінцамі — 1 (усяго 36 чал. з 40 ці 87,5%). Больш паловы апытаных з'яўляюцца выхадцамі са змешаных сем'яў (усяго 45: руска-літоўская — 14, руска-польская — 8, літоўска-польская — 6, беларуска-польская — 7 , беларуска-руская — 5, латышска-беларуская — 1, украінска-руская — 1, літоўска-яўрэйская — 1, літоўска-украінская — 1, беларуска-літоўская — 1) і маюць цяжкасці з канстатацыяй сваёй нацыянальнасці, часцей яе вызначаючы па маці (24 чал. ці 53%). Аднак у 8 чалавек уласная этнічная ідэнтыфікацыя не супала ні з адным з бацькоў. У такіх выпадках на першым месцы значыцца літоўская нацыянальнасць, сярод фактараў выбару якой галоўныя такія, як „нарадзіўся і жыву ў Літве", „закончыў літоўскую школу", „з дзяцінства размаўляю па-літоўску", што сведчыць пра моцны ўплыў сацыяльна-дзяржаўных фактараў.

Фота Міры ЛУКШЫ

— ***Беларусы ў Літве складаюць немалую частку насельніцтва.***

— На сучасны момант беларусы ў Літве з'яўляюцца трэцяй па велічыні нацыянальнай меншасцю пасля палякаў і рускіх і сканцэнтраваны пераважна ў вялікіх гарадах. На пачатку 1990-х гг. іх колькасць складала ў Вільні 5,3% ад агульнай колькасці жыхароў горада, Вісагінасе — 11,0%, Друскеніках — 3,8%, Коўне — 0,7%, Клайпедзе — 2,7%, Паланзе — 1,2%, Шаўлях — 0,9%. У раёнах найбольшая ўдзельная вага беларусаў фіксавалася ў Ігналінскім (7,5%), Віленскім (4,7%), Салечніцкім (3,8%), Троцкім (4,1%) раёнах. Па даных перапісу 2001 г. ад агульнай колькасці жыхароў краіны беларусы складаюць 1,23% (42 866 чал.), што значна меней у параўнанні з данымі 1989 г. (63 200 чал.). Перасяленне беларусаў з Літвы ў Беларусь пачалося ў 1990 г., калі вярнулася на радзіму 3 987 чалавек. У наступныя два гады іх колькасць павялічылася (1991 г. — 4 198 чал., 1992 г. — 6254 чал.), а затым эміграцыйная хваля стала памяншацца: 1993 г. — 3364 асобы, 1994 г. — 1540, 1995 г. — 572.

— ***Як можна падзяліць літоўскіх беларусаў па часе пражывання?***

— На дзве групы. Першая — аўтахтоннае насельніцтва, якое захавала сваю традыцыйную культуру і фальклор; другія — тыя, хто прыехаў у Літву на вучобу або працу пасля другой сусветнай вайны. Дадаткова можна вылучыць хвалю эміграцыі беларускай інтэлігенцыі ў пачатку 1990-х гг., абумоўленую спрыяльнай нацыянальна-культурнай палітыкай Літоўскай Рэспублікі.

— ***Якая сацыялінгвістычная характарыстыка беларуса?***

— Гэта гарадскія жыхары (85,24% ад усёй колькасці) працаздольнага ўзросту (65,8%), мужчыны складаюць 47,7%, жанчыны — 52,3%, склад тыповай сям'і — тры ці чатыры чалавекі, сацыяльны склад — пераважаюць працоўныя (63,1%) і службоўцы (31,4%), асноўныя сферы дзейнасці — вытворчыя (прамысловасць, будаўніцтва, транспарт — 77,0%).

— ***Паўднёва-ўсходняя Літва — найбольш беларуская?***

— Гэта для беларускай этнічнай групы рэгіён традыцыйнай нацыянальнай культуры, дзе ёсць беларуская мова, аўтэнтычны фальклор, культурныя і асветніцкія традыцыі. Беларускі культурны элемент трывала прысутнічае і досыць акрэслена выяўляецца.

— ***Ці грунтоўна даследаваўся беларускі народ і яго культура на гэтай тэрыторыі?***

— На сёння грунтоўныя сістэмныя даследаванні беларускага этнасу на гэтай тэрыторыі практычна адсутнічаюць. Варта адзначыць этнаграфічнае апісанне рэгіёна ў другой палове XIX ст. — Кіркора, Карскага, Тышкевіча, Гільтэбрандта, Дмітрыева, Крачкоўскага, Гукоўскага, а таксама ў XX ст. — Ліса, Размукайтэ. У 1970 г. была праведзена сумесная навуковая экспедыцыя Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР і Інстытута фальклору і літаратуры АН ЛітССР на этнаграфічнае памежжа з мэтаю высвятлення этнакультурных працэсаў. Да значных здабыткаў гістарычнай навукі Літвы і Беларусі адносіцца праца Кастуся Езавітава „Беларусы ў Літве" (1932), дзе аўтар разгледзеў розныя бакі існавання беларускай нацыянальнай групы ў 20-х — пач. 30-х гг. XX ст., якая налічвала не менш за 40-45 тыс. чалавек.

Адносна актыўна даследаваны і вывучаюцца цяпер асноўныя пытанні беларускага культурнага, палітычнага і адукацыйнага развіцця на тэрыторыі Віленшчыны ў канцы XIX — пач. XX ст. (Меркіс) і ў міжваенны час (Вабішчэвіч, Трафімчык). Адзначаны спробы апісання беларускай дыяспары ў Літве ў сінхронным і дыяхронным аспектах (Ціхаміраў, Раманоўскі).

— ***У чым праяўляюць сябе беларусы ў Літве?***

— Беларуская культурная прастора ў Літве прадуцыруе сябе, найперш, у фальклорным, лінгвістычным і адукацыйным планах, а таксама праз дзейнасць культураўтваральных сегментаў і аказвае актыўны ўплыў на агульную культурную сітуацыю ў краіне. Але на працягу апошніх 60 гадоў у выніку неспрыяльных палітычных фактараў усталявалася сітуацыя, пры якой беларусы не мелі магчымасці рэалізоўваць сваіх нацыянальных і культурна-адукацыйных запатрабаванняў праз адпаведныя структуры. Практычна страціўшы ўласную інтэлігенцыю, беларуская этнічная група спазнала моцную моўную і культурную дэнацыяналізацыю.

У канцы 80-х — пачатку 90-х XX ст. у Літоўскай Рэспубліцы пачалося стварэнне новага культурнага, ментальнага і эканамічнага асяроддзя. Кожная нацыянальная супольнасць краіны ўдзельнічала ў гэтым працэсе і фарміравала ўласную сацыяльна-культурную інфраструктуру на сваёй роднай мове. Пад уплывам росту духоўных пачаткаў народаў Літвы актывізавалася і беларускае культурнае жыццё: з'явіліся першыя культурныя арганізацыі — Таварыства беларускай культуры, Клуб аматараў беларускай народнай творчасці „Сябрына" (1988), рэгіянальныя беларускія арганізацыі, Таварыства беларускай школы (1993), газеты „Наша ніва" і „Рунь", праграмы на літоўскім радыё і тэлебачанні, кафедра беларускай мовы, літаратуры і этнакультуры на факультэце славістыкі Віленскага педагагічнага інстытута, нядзельная беларуская школа, затым агульнаадукацыйная, службы ў касцёле і царкве на беларускай мове.

— ***Сродкі масавай камунікацыі і нацыянальная адукацыя — адзін з самых эфектыўных спосабаў духоўнага і інтэлектуальнага ўздзеяння на асобу.***

— Таму важна, каб канкрэтная нацыянальная супольнасць ажыццяўляла гэта ўздзеянне на роднай мове. Сродкі масавай інфармацыі для беларусаў Літвы з большага адпавядаюць колькасным суадносінам беларусаў да астатніх нацыянальнасцей краіны, хоць у гэтай галіне ёсць рэзервы. На дадзены момант (з 1989 г.) у эфіры Літоўскага нацыянальнага радыё выходзіць літаратурна-мастацкая перадача „Беларускае слова на хвалях Літоўскага радыё" (рэд. — Эдыта Шукевіч, Іна Ляшкевіч), якая ў 1990-1991 гг. выходзіла пад назвай „Запрашае «Сябрына»", штотыднёвая паўгадзінная перадача „Тутэйшы час", у 1992-2003 гг. — аналітычная перадача „Навіны для беларусаў Літвы" (рэд. — Ёнас Лаўрынавічус). Рэгулярна навіны культурнага жыцця беларускай супольнасці асвятляюцца ў беларускай праграме польскага радыё „Палонія" (рэд. — Андрусь Старавойтаў). Непрацяглы час працавала недзяржаўная радыёстанцыя „Балтыйскія хвалі", якая паралельна з рэтрансляцыяй рыхтавала арыгінальныя радыёперадачы. На літоўскім тэлебачанні з 1991 г. выходзіць перадача „Віленскі сшытак" (рэд. — Тацяна Дубавец).

У газетах „Советская Литва" і „Czerwony Sztandar" у канцы 1980-х гг. з'явіліся першыя беларускія старонкі. У 1992 г. выйшла некалькі нумароў газеты „Вільня і край" лацінскім і кірылічным шрыфтамі (адказны за выпуск — Сяргей Вітушка), а таксама на працягу некалькіх гадоў выходзіла ў свет рэгіянальная газета ў Салечніках „Наша старонка" (гал. рэдактар — Пётра Малафей).

Па ініцыятыве Таварыства беларускай культуры і пры яго актыўным удзеле з лістапада 1993 г. да канца 1994 г. друкавалася старонка „Беларус Віленшчыны" ў рэспубліканскай газеце „Эхо Литвы", а з верасня 1994 г. па сакавік 1995 г. — у газеце „Kurier Wileński". На працягу 1991-2001 гг. падзеі, што адбываліся ў беларускім культурным жыцці ў Літве, знаходзілі адлюстраванне на старонках адноўленай газеты „Наша ніва" (галоўны рэдакатар — Сяргей Дубавец).

З 1997 г. выдаецца газета на беларускай мове „Рунь" (гал. рэд. — Алег Мінкін), а з 2005 г. — інфармацыйны бюлетэнь Згуртавання беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве (кіраўнік — Лявон Му-

працяг ☞11

Пушча буйнее

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Труізмам ужо з'яўляецца канстатацыя, што Гайнаўшчына пакрысе згортваецца. Пра напрамак дрэйфу павятовага цэнтра можна асведаміцца на тамашнім чыгуначна-аўтобусным вакзале. Пабудаваны на схіле камуны аб'ект зараз вітае сваіх нешматлікіх гасцей шматлікімі закрытымі дзвярнымі і аконнымі праёмамі. Яшчэ ранішні цягнік-рэйкабус, які прыязджае ў Гайнаўку перад паловай восьмай, набіты бітком, бо з яго высыпаецца шмат народу, але гэта ўжо не тое, што сорак гадоў таму. Магчыма, што таму рэйкабусу, якога дызайн паказвае, што ён не павінен працаваць ужо больш чым на паўштату, і такая колькасць цяперашніх пасажыраў не пад сілу, бо ўжо ў зваротнай дарозе ў Чаромху, за прыпынкам Вітава, па салоне пайшоў нейкі несімпатычны пах. Устрывожаным пасажырам загадчык грукатлівага поезда сцвердзіў, што нешта са счапленнем мусіць быць не так. Я ўжо пачаў мірыцца з тым, што такі хваравіты цягнік не дацягнецца да наступнага прыпынку, але даехаў. І са скрыгітаннем сваіх аджываючых век часцей паехаў далей.

Вуліца ў Палічнай

Яшчэ нядаўна на будыначку станцыі Палічная была прыпынкавая шыльда. Цяпер ужо прыпынак карыстальнікам чыгункі ананімны, адно на пероне трымаецца яшчэ таблічка з раскладам цягнікоў. Сам будыначак выглядае як нарыхтаваная да абароны перад нейкім штурмам крэпасць з забітымі металічнымі плітамі вокнамі...

Вакол чыгункі, пачынаючы ад прыпынку Арэшкава, вырасла ўжо стройнае папаўненне Белавежскай пушчы. Вось і да шашы, што перасякае чыгунку побач прыпынку Палічная, даходзіць з гэтага лесу гук мотапілы, на лясной прасецы відаць метры дроў. Уяўляю сабе, што яшчэ некалькі дзесяткаў гадоў таму на месцы гэтага лесу коні цягалі плугі, бораны, спружыноўкі, а земляробы шпацыравалі па тым месцы, высыпаючы ў раллю зерне з саламяных каробак, а жнеі гнулі спіны над сярпамі...

Заходжу ў Курашава, невялікую вёску, у якой зараз крыху за дзесяць хат; каля паловы з іх здаецца пуставаць. Гаспадарчых будынкаў мала, некаторыя панадворкі выстрыжаны. Напатканы мною вясковец пацвердзіў маё ранейшае ўяўленне, што тут навокал былі калісь апрацоўваныя палі. Зараз у вёсцы захаваліся адзін конь і адна карова. Мабыць, захавалася і некалькі трактароў і машын да падчэпкі, але іх на панадворках не відаць; пабачыў я толькі адзін конны воз. Людзі яшчэ крыху поля вакол вёскі ўзрыхляюць. Але глеба тут слабая — за вёскай паказваецца такі быццам пустынны лапік, на якім нават пустазеллю няма ахвоты прабаваць сваіх сіл у здабыванні зямельных сокаў. Вёска асталася быццам на паляне, на якую наступаюць і пасадкі, і самасеі. Дзеці ў Курашаве, мабыць, яшчэ ёсць, вучацца яны ў Кляшчэлях і Гайнаўцы, але колькі зараз тых дзяцей, мой субяседнік не хацеў сказаць; магчыма, што гаварыў ён пра дзяцей агульна, пра тых, якія былі ў вёсцы раней... Калісь людзі трымаліся гэтай слабой зямелькі, мабыць, таксама працавалі на блізкай чыгунцы, але калі перад маладым пакаленнем адкрыўся шырокі свет, багацейшы перспектывамі, яно ў той свет і падалося.

Перад Курашавам, з боку шашы з Кляшчэль у Палічную, у драўлянай агароджы стаяць два векавыя драўляныя крыжы. Адзін з іх хаваецца ўжо ў голле акружаючых дрэў, другі, крыху маладзейшы і „адважнейшы", паказвае сваім выглядам, што ён ужо праходзіў шматлікія рамонты. Відаць гэта па прыбітай рамонтнымі майстрамі нізам уверх перакладзіне. Ну і тыя крыжы, якія ў сваёй маладосці былі стройнымі і высокімі, у выніку падгнівання камлёў многа ўжо страцілі са свайго хвацкага росту. Новых вывадных крыжоў няма, бо можа і гэтыя адправяць апошняга жыхара вёскі ў лепшы свет.

І да Палічнай лес падыходзіць упрытык да панадворкаў, хаця тут яшчэ захавалася крыху прасторы. Вось ад Курашава ёсць велікаваты вадаём, за якім, як на карцінах народнага прымітыўнага мастацтва — толькі без лебедзяў і аленяў, патанае ў вадзяной расліннасці адзінокая хатка. Хатку тую, за „возэрам", паставіла калісь „кулко". Каля вёскі працякае аднайменная рачулка Палічная, над якой захавалася крыху пашы. Школьны будынак, мабыць, з ліку „тысячагодак", калісь абсаджаны лістоўніцамі, абрастае цяпер і іншай раліннасцю. Некаторыя вокны адкрыты на прыроду...

Заходжу ў салтысоўскую хату даведацца ў гаспадыні пра ейную вёску. Але спадарыня солтыс ў цэйтноце, акурат выбіраецца на гмінную сесію ў Кляшчэлі, таму і размова ў нас кароткая, адно наконт пабачанай дагэтуль мною школы. У Палічнай зараз пражывае каля ста шасцідзесяці пяці душ, у тым ліку тузін дзяцей школьнага ўзросту. Згаданая раней школа закончыла сваю працу ў 1997 годзе. Толькі адзін чалавек у вёсцы, як даведаюся пазней, звонку Палічнай, займаецца сельскагаспадарчай дзейнасцю; набраў ён зямлі з дзяржаўнага фонду. У адным з былых калгасных будынкаў свінарнік. Іншыя вяскоўцы крыху абрабляюць свае землі, перапісаныя на гарадскіх дзяцей.

Крыху далей засмучвае выгляд пажарнага дэпо, на якім шыльдачка, што быў ён узведзены з дапамогай страхавой фірмы PZU. У нашых вясковых умовах дэпо выконвае ролю святліцы, але ўваход у гэты будынак больш штурмуе трава чым жыхары вёскі. Хаця зрух ёсць, бо дах новы, бляшаны. Але на сцены наступае час, а праёмы ў супрацьлеглай да вуліцы сцяне ветраюцца, мабыць, у выніку дзейнасці двухногіх істот. Пажылыя жанчыны, з якімі я перакінуўся словам, сказалі мне, што ў святліцы патанцоўкі адбываюцца ў час канікул, калі да мясцовых пажылых жыхароў з'язджаюцца гарадскія ўнукі, а ў час іхняй маладосці танцавалі па хатах. Перад будынкам дэпо невялікі лапік плошчы пакрыты прарастаючым травою асфальтам — там калісь таксама ладзіліся патанцоўкі.

У цэнтры Палічнай крама, а насупраць яе, у засені дрэў за блакітна-зялёным цэментным крыжам з такога ж колеру металічнай агароджай, засядае мясцовы „сельсавет", група мужчын. І дзяжураць яны там з раніцы да вечара. Заглядае туды пад вечар паліцыя або пагранахова і тады мужыкі разыходзяцца. У выніку механізацыі, індустрыялізацыі, глабалізацыі і іншых -ацый традыцыйная праца ў вёсцы страціла сэнс, вяскоўцам астаецца адно думанне, як скарыстаць агромнае багацце часу, якога наступу яны калісь не прадбачылі. І непатрэбная цяпер сялянам зямелька карыстаецца іх абыякавасцю да сябе, узгадоўваючы са свайго лона малады лес, авангард буйнеючай Белавежскай пушчы.

Падаюся ў наступную вёску, або — лепш сказаць — на наступную паляну, яшчэ населены астравок у заліваючай гэтую частку Гайнаўшчыны Белавежскай пушчы. У Войнаўцы на вуліцы ціха, чуваць толькі пыхценне двух трактароў, па адным на кожным загуменні вёскі. У даліне рэчкі Палічнай відаць выкапаныя сажалкі; Палічная, якой крыніцы каля Курашава, за Старыной праходзіць у Беларусь, дзе ўліваецца ў раку Белую, а тая ў „гайнаўскую" Правую Лясную, якая разам з Левай Лясной, сабраўшы воды з паўднёвых акраін Белавежскай пушчы, каля Брэста ўліваецца ў „наш" Буг.

У Войнаўцы заводжу гутарку з пажылымі жанчынамі, якія прыселі на адной з лавачак пасля візіту ў аўтакраму. Інфармуюць яны мяне, што зараз у Войнаўцы пражывае каля сямідзесяці душ. Пытаю пра будынак каля аўтобуснага прыпынку, ці гэта не колішняя школа. Гэты будынак быў прывезены звонку і мае выконваць ролю вясковай святліцы. А школы ў Войнаўцы не было. Мясцовыя дзеці вучыліся спярша ў Ядлоўцы, дзе раней быў панскі двор, а пасля ў Старыне, калі там пабудавалі новую школу.

Цікавасць кіруе мяне ў Ядлоўку; добрыя войнаўскія людзі растлумачылі мне, як туды дабрацца па лясных лабірынтах. Зараз за Войнаўкай, на палетку, аддзеленым ужо ад вёскі паласой стройнага маладога сасняку, бачу асаблівую копку бульбы. Ёсць там усё: і трактар з бульбакапалкай, і капальнікі, і выараны амаль цэлы палетак, толькі мяшкоў з бульбай не відаць. Затое на дарозе побач стаіць трактар з прычэпленым да яго возам з некалькімі мяшкамі са збожжам. Пытаю пажылога трактарыста, чаму бульбы не відаць, а ён патлумачыў мне, што спярша былі працяглыя дажджы і частка бульбы вымакла, пасля наступіла засуха, а пасля яе на бульбу ўпала зараза і ўраджай не атрымаўся. А ён сам збіраецца сеяць трыцікале.

Дарога з боку Палічнай у Ядлоўку абсаджаная старэйшымі дрэвамі: дубамі, ліпамі, бярозамі, елкамі; значыць, калісь пралягаў там гасцінец. Двор у Ядлоўцы стаіць самотна, усе вокны будынка закрыты аканіцамі; на свет глядзяць толькі тры зашклёныя ганкі. Дах пакрыты роўненькай гонтай. Пан пакінуў нажытае месца з прыходам саветаў у 1939 годзе. Наконт гэтага здарэння людзі расказваюць розныя версіі. Жанчыны ў Войнаўцы гаварылі мне, што яго саветы пагналі амаль голага, а жыхар Старыны сказаў мне, што ягоны дзед завёз пана ў Камянец. Апрача Ядлоўкі панскі маёнтак быў яшчэ ў Белай Стражы, але тамашні пан, брат гэтага з Ядлоўкі, прадаў яго новым пасяленцам.

Зараз пасля вайны двор у Ядлоўцы занялі польскія пагранічнікі, арганізуючы там заставу і выкарыстоўваючы ўсе панскія будынкі, з якіх да сёння захаваўся толькі жылы панскі дом. Стаяць яшчэ рэшткі цаглянай сцяны ад дабудаванай войскам стайні. А застава налічвала каля сарака салдатаў, якія пільнавалі граніцу ад ракі Лясной да Чаромхі або Апакі. Яны пакінулі двор у Ядлоўцы, калі граніцу сталі пільнаваць саветы. Пасля ў былым панскім двары працавала школа, жылі тут настаўнікі. Школа недзе каля 1960 года была перанесена ў новы будынак, бадай „тысячагодку", пабудаваны ў Старыне. А панскі двор апусцеў. Шмат з двара расцягнулі навакольныя жыхары, гаспадарчыя будынкі былі знесены, астаўся толькі галоўны дворскі жылы будынак. Цяпер ён вярнуўся ў сумеснае ўладанне бадай чатырох спадкаемцаў пана, якія заглядаюць тут у летні час, і то не ў кожнае лета; у Старыне жыве адна з панскіх унучак.

Дарога з Ядлоўкі ў Старыну мае насціл з сухога пяску, цяжка ёю хадзіць, мяркую, што цяжка і ездзіць. Пры выхадзе на асфальтоўку, што з Войнаўкі ў Старыну, заўважаю помнік з чырвонаармейскай зоркай; пастаўлены ён у памяць савецкага афіцэра. Задзівіў мяне надпіс на ім: „Здесь убит в бою..." Наколькі я прыгадваю савецкія абычаі, яны пісалі, што на вайне нейкі іх чын „пал смертью храбрых", „погиб смертью храбрых", але неяк не падыходзіць фраза „убит смертью храбрых". Падаецца так, быццам той афіцэр быў забіты не ворагам, але некім іншым... З прыходам галоснасці выходзяць да ведама шырэйшай публікі і некаторыя савецкія ваенныя абычаі, раней строга хаваныя цэнзурай. Менавіта шмат савецкіх байцоў загінула не ад варожых куль, але ад сваіх савецкіх. Бывалі трагічныя міжусобіцы паміж салдатамі. Былі ж г.зв. „заградотряды", якія бесцырымонна распраўляліся з адступаючымі байцамі. Але і камандзіры мелі права выносіць сваім падуладным прыгаворы і адразу іх выконваць. У гэтай справе сакрэтам палішынеля астаецца актыўнасць „маршала победы" Жукава, які бесцырымонна раскідаўся гарматнім мясам, у тым ліку ахвотна карыстаўся і гэтым правам. Паколь-

працяг ☞10

9 ☞працяг кі савецкія ваенныя матэрыялы ўвесь час засакрэчаны, невядома, колькі вынесеных сабою прыгавораў выканаў агіяграфаваны палкаводзец: дзесяткі, сотні, альбо і больш. Магчыма, што апрача савецкіх геройскіх зорак ён заслужыў і Жалезны крыж... Адмысловы помнік старшаму лейтэнанту Маскаленку, які быў „убит" каля Старыны, пастаўлены там мо таму, што ў яго такое ж прозвішча, як і ў аднаго з важнейшых савецкіх маршалаў.

У зарасніку за савецкім помнікам заўважыў я ледзь відочныя нашы намагільныя помнікі; на адным з іх гарэла лампадка. Пан з Ядлоўкі быў заснаваў там прыватныя могілкі, на якіх была пахавана ягоная жонка, пахаваны там таксама некаторыя жыхары Белай Стражы. Пан быў паставіў там і капліцу, але яна да нашага часу не захавалася.

Ужо ў Старыне завёў я гутарку з жанчынай, пра якую мне здалося, што вяртаецца з лесу з грыбамі; але яна вярталася ад нейкай гаспадыні, у якой купляе яйкі. Жыве тая жанчына цяпер у былым школьным будынку, які цяпер стаў асяродкам сацыяльнай апекі, а больш непасрэдна кажучы — домам для састарэлых. Цяпер у ім пад дваццаць жыхароў, большасць з іх, так як і мая суразмоўніца, пераселены сюды два гады таму з Дому заслужанага чыгуначніка, што быў у Міляноўку за Варшавай. Мелі там правесці рамонт і вярнуць у яго заслужаных працаўнікоў чыгункі. Але той рамонт цягнецца надта доўга і падваршаўскія пенсіянеры мяркуюць, што чыгуначныя ўлады памянялі яго на вартасны тавар, дарагую нерухомасць памянялі на грошы, а старых людзей пакінулі дажываць старасць у Старыне...

Двор у Ядлоўцы

Вясковая крама ў Старыне даўно ўжо не гасціла пакупнікоў. Захавалася там яшчэ крыху клуняў, але земляробства ўжо аджылося. На пашы праводзіць час невялікі статак коней. У Старыне шмат старых крыжоў. У цэнтры вёскі ансамбль з пяці крыжоў, каля якіх калісь праводзілі пакойнікаў на вэрстоцкія могілкі. Калі праклалі асфальт, вывадную ролю стаў выконваць крыж, што недалёка ад былой школы.

Са Старыны задумаў я пайсці ў Мацкевічы — гэта неафіцыйная назва, бо афіцыйна вёска тая называецца Доўгім Бродам. Людзі падалі мне каардынаты лясных дарог і я даверліва падаўся па гэтай лоцыі. Але не надта далёка за Старыной тая дарога, што мела мяне вывесці проста ў Мацкевічы, пераўтварылася ў бездарожжа. Праўда, след колішняй дарогі — з эпохі, калі там яшчэ не было лесу — быў: нібы роў, нібы насып, нібы прасвет... Трымаючыся гэтых арыенціраў, выйшаў я на асфальтоўку і неўзабаве апынуўся перад Вілюкамі. Калі так склалася сітуацыя, тады я і маршрут змяніў, не заходзіўшы ў Вілюкі і нацэліўшыся ў бок Малых Пасечнікаў...

Выйшаў я за Вілюкі, за лес. Спачатку адкрылася мне невялікая прастора, якая не закрывалася, але пашыралася. І Пасечнікаў тых, Малых, неяк не ўдавалася мне зафіксаваць. Палі, што паявіліся ў полі майго зроку, былі напалову пад аблагамі. Паказаліся пашы, на іх у адным месцы пасвіліся дзве кароўкі, у іншым таксама дзве, яшчэ ў іншым конік; тыя разлеглыя пашы, на якіх не было вялікага дабытку, не былі, аднак, запушчаны. Дайшоў я да балоцістых сенажацей, за якімі паказалася мне нейкая вёска. Давай я па тых балотах брысці ў яе напрамку, даўгавата я брадзіў па поймах вярхоўяў рачулкі Орлі пакуль пабачыў дарожную шыльдачку з назвай вёскі: Доўгі Брод. Мабыць, тыя людзі, што далі вёсцы такое названне, дабіраліся ў тое месца такім жа шляхам, што і я...

На канцы Вітава, што з боку Доўгага Броду, стаіць помнік траім мясцовым членам Польскай рабочай партыі, якія 10 мая 1945 года ў пасляваенных баях былі „убиты" лясным атрадам „Зыгмунта"... Хто ведае, ці той помнік пасляваеннага мінулага не будзе знесены ў выніку цяперашніх спроб „зачысткі" гістарычнай праўды ад „няправільнай" мінуўшчыны. Адкуль тыя нешчаслівыя вяскоўцы маглі тады ведаць, што шэсцьдзесят гадоў пасля вайны іх намаганні наладзіць на свой лад мірнае жыццё акажуцца пад кляймом? Адкуль ведаць нам цяпер, ці нейкія будучыя радыкалы не выдвараць памяць пра наша пакаленне на сметнік гісторыі?..

Поезд, у якім я вярнуўся ў Гайнаўку, у нічым не нагадваў таго, у якім я з Гайнаўкі выехаў. Быццам не па новых лясах Гайнаўшчыны я хадзіў, а вярнуўся з міжпланетнага падарожжа ў новую эпоху, быццам з XIX стагоддзя пераскочыў у XXI. Ціхі і выгадны поезд нёсся край пушчы як край райскага саду, у якім колькасць насельніцтва набліжаецца да райскіх стандартаў.

Не так лёгка сустрэць чалавека, які б ніколі ў жыцці не гуляў у шахматы альбо ў шашкі. Гэтыя два віды гульняў трывала ўкараніліся ў наша жыццё, і для дарослага чалавека яны з'яўляюцца не толькі спосабам для добрага баўлення часу, але і выдатнай зарадкай для розуму.

Значна менш вядомай і таму менш папулярнай з'яўляецца гульня, што называецца кароткім і дзіўным словам „го". Яна таксама належыць да гульняў шашачнага тыпу, гэта значыць, што мае косткі і дошку.

Да нядаўняй пары прачытаць штосьці ў інтэрнэце пра гэтую гульню па-беларуску было немагчыма. Але паколькі ў жыцці, як вучаць перш за ўсё ўсходнія мудрацы, нішто не бывае назаўсёды, з'явіўся ў сусветным павуцінні беларускамоўны сайт пра го.

Калі цікаўны карыстальнік інтэрнэта набярэ на сваім камп'ютары адрас **weiqi.at.tut.by**, то перад яго вачыма з'явіцца неардынарна зробленае выяўленне сайта. Упрыгожаная элементамі беларускага арнаменту, галоўная старонка змяшчае выйсці да іншых рубрык. Уверсе справа, пэўна, як сімвал агульнай зацікаўленасці ў го, месцяцца выяўленні сярэдневяковага самурая і магната часоў Вялікага Княства Літоўскага.

Рубрык на сайце нямнога, але ўсе яны даволі падрабязна распавядаюць пра гісторыю і сучаснасць усходняй гульні. Прыемна, што аўтар сайта не з'яўляецца інкогніта — гэта Сымонка Салавейка. Аўтар дае ўласны каментарый да створанага партала на асобнай старонцы.

„Гэты сайт створаны аматарамі го, якія адначасова і аматары беларускай мовы, — адразу тлумачыць Сымонка. — Яго задача — не абмежаваньне кола аматараў го ў Беларусі толькі беларускамоўнымі гульцамі, але наадварот, пашырэньне гэтага кола яшчэ і на беларускамоўных жыхароў нашай бацькаўшчыны ды папулярызацыя беларускай мовы ў го. Менавіта для гэтага і заплянаваўся пераклад інтэрактыўнага падручніка Хірокі Моры, каб з аднаго боку — зьвярнуць увагу на го ў беларускамоўным інтэрнэце, а з другога — каб сярод тых 24 моваў, на якія ўжо падручнік перакладзены, і дзе ёсьць нават малыя мовы, тыпу мовы баскаў, таксама зьявілася і беларуская мова. І яна зьявілася! Стаіць на 26 месцы".

Што такое го ці вэйчы — другая назва гульні? Адказам на гэтае пытанне з'яўляецца адпаведная старонка сайта. „Дух Го — дух воіна і стратэга. Дух Го — роднасны духу баявых мастацтваў. Майстар бою і сапраўдны стратэг маюць тры ступені сілы: „меч у руцэ", „меч у сэрцы" і найвышэйшая ступень майстэрства, гэта калі майстар паклаў меч у ножны і ахаладзіў сэрца, несучы мір і супакой у Сусьвет".

Варта адзначыць, што гульня го ўзнікла ў Кітаі, затым распаўсюдзілася на Японію, іншыя краіны Азіі, а пасля прыйшла ў Еўропу. Пра тое, як гэтая гульня „пачувае" сябе ў Беларусі мусіць распавядаецца на старонцы „Хікару-но-Го ў Беларусі", аднак там пакуль, як тлумачыць аўтар, ідзе накапленне матэрыялаў. Таму жадаючым высветліць гэтае пытанне застаецца пашукаць адказ на яго на іншых сайтах.

Каб знаёмства з го па-беларуску не засталося папросту знаёмствам, варта зазірнуць у рубрыку „Інтэрактыўны падручнік Го". І тады невыключана, што вы авалодаеце гэтай даволі нескладанай усходняй гульнёй.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Спакойны кастрычнік

Кастрычнік не быў асабліва насычаны буйнейшымі турнірамі, тым не менш у некаторых відах спорту адбыліся значныя спаборніцтвы. Пачынаем традыцыйны агляд з вылучэння лепшых камандаў, а таксама вызначэння правалаў месяца. Асобна тут стаіць футбольны барысаўскі БАТЭ, які рэкордна датэрмінова стаў чэмпіёнам краіны, а таксама здабыў першую вікторыю ў Лізе Еўропы. Вельмі паспяховым для беларускай дружыны стаў чэмпіянат кантынента па спартовай акрабатыцы — цэлы россып — ажно 12 медалёў. Золата ў шматбор'і ўзяў мужчынскі квартэт, за які выступалі Кірыла Шатаў, Арцём Хвалько, Вадзім Уласевіч і Кірыла Ждановіч. Яны ж сталі бронзавымі прызёрамі ў так званым тэмпавым практыкаванні. Яшчэ адно золата ў скарбонку прынёс жаночы дуэт Аліна Юшко — Кацярына Мурашка. Гэтыя ж дзяўчаты першынствавалі ў балансавых практыкаваннях і сталі трэцімі ў тэмпавых. Вызначылася і жаночае трыо — Ганна Дудкоўская, Юлія Хрыпач і Аліса Усманава здабылі ў розных відах срэбра і бронзу. Яшчэ 5 медалёў на рахунку беларускіх юніёраў. Вылучаем цэлую каманду ў лепшыя.

Айчынныя самбісты заваявалі 7 медалёў на этапе Кубка свету ў Пецярбургу — добры знак перад чэмпіянатам свету! На жаль, на чэмпіянаце свету без лаўраў выступілі нашы фехтавальнікі. Шаблісты камандай занялі высокае 6-е месца, а вось індывідуальна выступілі ніжэй сваіх магчымасцей. Засмуціла жаночая гандбольная зборная, якая ў самым важным матчы года пацярпела жорсткую паразу ад Славеніі 21:30. Зусім слаба выглядала валейбольная мужчынская зборная на адкрытым Кубку Расіі, саступаючы ўсім камандам запар. Засмуціла і траўма Вікторыі Азаранкі, якая мела высокія шанцы на выніковым тэнісным турніры года сярод мацнейшых ракетак свету.

У цэлым выбар асоб, якія найбольш вызначыліся ў кастрычніку, быў небагатым. У спісе пераважаюць на гэты раз самбісты-дзюдаісты.

1. Уладзімір Самсонаў (настольны тэніс) стаў трохразовым уладальнікам Кубка свету. На прэстыжным турніры ў Маскве сярод мацнейшых прафесіяналаў планеты ён узяў галоўны прыз. Да гэтага Самсонаў перамагаў на Кубку ў 1999 і 2001 гадах.

2-3. Юрый Рыбак (самба) у Пецярбургу здабыў золата ў катэгорыі звыш 100 кг.

2-3. Яўген Сёмачкін (самба) там жа дасягнуў першага месца ў вазе да 100 кг.

4. Аляксей Сцепанькоў (самба) падтрымаў зачын сяброў па камандзе і ўзышоў на другую прыступку п'едэстала ў катэгорыі да 82 кг.

5. Аляксандр Царэвіч (спартовая гімнастыка) быў адзіным з беларусаў, хто на чэмпіянаце свету трапіў у дзесятку ў асобных відах — ён стаў 7-м у практыкаванні на папярэчыне.

1. Вікторыя Чайка (кулявая стральба) у фінальнай частцы Кубка свету, што прайшоў у Кітаі, сярод сусветнай эліты вызначылася сярэбраным медалём у практыкаванні з пнеўматычным пісталетам.

2. Тацяна Масквіна (самба) папоўніла сваю ўнікальную калекцыю чарговым золатам (катэгорыя да 48 кг) на вышэй згаданым турніры.

3. Вольга Гаварцова (тэніс) на прэстыжным турніры за Кубак Крамля здолела выйсці ў фінал адзіночнага разраду, што стала яе вышэйшым дасягненнем у кар'еры.

4. Настасся Ляшкова (самба, дзюдо) на спаборніцтвах па самба была ўганаравана серабром, а ў Мінску на дзюдаісцкім турніры прымерала на шыю бронзавы медаль (вага да 64 кг).

5. Вольга Лешчанка (дзюдо) стала другой (катэгорыя да 48 кг) на мінскім этапе Кубка свету.

Будзем чакаць важкіх дасягненняў беларускіх спартоўцаў у лістападзе.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Артымовіч і Кабзар у Гайнаўцы

Першай навінай у дзень (24.10.2009), калі меў адбыцца паэтычна-музычны канцэрт Надзеі Артымовіч і Алега Кабзара, была інфармацыя пра паэтычны фестываль імя Чэслава Мілаша ў Кракаве. Арганізатары не прадбачылі, што зацікаўленне падзеяй будзе настолькі вялікае і што прыйдзецца ім шукаць большае памяшканне. Звестка, што на чытаннях паэзіі ў Кракаве з'явілася за тысячу слухачоў з цэлага свету, уражвала. Адначасова ўражвала прапанова ЗБМ, каб у рамках „Бардаўскай восені" ладзіць паэтычныя сустрэчы. Хоць поспех такой прапановы, на першы погляд, здаваўся немагчымы. Хто ў нас цікавіцца беларускай паэзіяй? Нават у гераіні вечара не было вялікіх спадзяванняў:

— Я буду рада, калі прыйдзе якіх пяць асоб, — сказала Надзея Артымовіч. — Хто з нашых людзей схоча адарвацца ад тэлевізара?

Так ці інакш у Гайнаўку, дзе меўся адбыцца канцэрт, публіка з'ехалася практычна з усіх куточкаў Беласточчыны. На канцэрт, які пачаўся з дваццаціхвілінным спазненнем, з'явілася ўсё ж восем разоў больш, чым спадзявалася паэтэса. У асноўным сустрэчай пацікавіліся студэнты ды людзі вольных прафесій. Праграму складалі аўтарскія чытанні і іх музычная інтэрпрэтацыя ў выкананні Алега Кабзара. Пасля паўтарагадзіннай сустрэчы, якая праляцела як чароўны міг, той-сёй зразумеў, што ў Гайнаўцы нешта здарылася. Гучныя воплескі, якімі публіка ўзнагародзіла выступаючых (стоячы), заставілі паэтэсу прачытаць яшчэ адзін твор. Паколькі канцэрт пачаўся з верша „Ад'язджаючым" і завяршыўся творам „Паэты паміраюць тады", — уся падборка ўключала творы напісаныя ў 70-я гады XX стагоддзя, — дык на біс зачытаны быў верш з навейшага зборніка „Жоўтая музыка" (Беласток 2005). Атрымалася быццам метафізічны каментарый да сказанага і пражытага:

Над Бельскам шэрае неба
шэры брук шэры парог забыты
музык

на шэрым парозе
Бельск
мястэчка памежжа мястэчка
бязмежжа

на шэрым парозе
стары музык
заснуў

Але ў Гайнаўцы было інакш. Пасля канцэрта публіка, выканаўцы і арганізатары выглядалі на ўзбуджаных і натхнёных. Апошняя справа ўразіла не менш, чым звесткі пра агромністае зацікаўленне кракаўскім паэтычным фестывалем. У нас адбылося падобнае, хаця месцы ў беларускім музеі, дзе адбывалася прыгожа-метафізічная імпрэза, далёка не ўсе былі запоўненыя...

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

КАФЕДРА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ
Філалагічны факультэт
Універсітэта ў Беластоку
запрашае на

Беларускія чацвяргі інтэрдысцыплінарны канверсаторый

5 лістапада 2009
доктар Галена Глагоўская
„У пошуках традыцыі польска-беларускіх адносінаў: Францішак Аляхновіч і «Віленскі кур'ер»"
17.00, вул. Лінярскага 3, зала 1Б

8 ☞працяг рашка). З нагоды значных дат і падзей Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны Віленскага краю выпускае „Беларускія навіны" (рэд. — Яўген Кепул).

Калі гаварыць пра беларускія культурныя арганізацыі, то трэба адзначыць, што за апошняе дваццацігоддзе яны з'явіліся практычна ва ўсіх месцах кампактнага пражывання беларусаў. Гэта зрабіла неабходным стварэнне структуры, якая займалася б каардынацыяй іх культурнай і асветніцкай дзейнасці. Сёння ў Згуртаванне беларускіх грамадскіх арганізацый пад кіраўніцтвам Лявона Мурашкі ўваходзіць больш за 20 арганізацый, кожная з якіх мае свой працоўны план і ўдзельнічае ў сумесных мерапрыемствах (Купалле, Каляды, Свята беларускай песні і г. д.) Асноўныя задачы аб'яднання — захаванне і развіццё беларускай грамадскай дзейнасці, беларускай мовы і культуры ў Літве, выхаванне нацыянальнай свядомасці беларусаў, што пражываюць у Літоўскай Рэспубліцы, паважлівае стаўленне да прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей. Сярод беларускіх арганізацый, якія дзейнічаюць асобна ад Згуртавання беларускіх грамадскіх арганізацый, адзначым Таварыства беларускай культуры (старшыня — Хведар Нюнька), асноўнай задачай якога з'яўляецца захаванне і трансляцыя гістарычнай беларускасці Вільні, Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны Віленскага краю (старшыня — Юры Гіль), якое шмат зрабіла для адраджэння памяці Францішка Багушэвіча ў вёсцы Свіраны (*Svironys*) Віленскага раёна, грамадскі музей імя І. Луцкевіча (старшыня — Людвіка Кардзіс) і інш. Кожны пасвойму яны займаюцца прапагандай беларускай культуры ў Літве.

Наяўнасць беларускай элітарнай культуры выяўляецца праз выразны пласт творчасці беларускіх мастакоў, літаратараў, перакладчыкаў, музыкаў.

У 2001 г. быў выдадзены літаратурна-мастацкі зборнік „Дарункі бацькоўскай зямлі" , у якім былі сабраны творы беларускамоўных аўтараў Літвы, розных па ўзросце і сваіх занятках. Большасць аўтараў, акрамя беларускай мовы, пішуць па-руску і па-польску, што з'яўляецца традыцыйным для полікультурнай Віленшчыны. У працяг яму — зборнік дзіцячай і маладзёжнай літаратурнай творчасці „У шматгалосай Вільні гучыць мая родная мова". Варты ўвагі сумесны праект беларускіх, польскіх і літоўскіх пісьменнікаў (Žodžiai ir spalvos 2008), а таксама анталогія беларускай паэзіі ў перакладзе на літоўскую мову (Sviesa 2008). У канцы 1990-х гг. у краме „Santarv—X" быў арганізаваны продаж кніг на беларускай мове.

— ***А як з традыцыйнай культурай беларусаў?***

— Яна досыць развітая і папулярная, ажыццяўляецца праз захаванне нацыянальных звычаяў і іх трансляцыю ў іншанацыянальнае асяроддзе. У такіх выпадках інтэграцыя стварае своеасаблівы сацыяльна-культурны фон, на якім культурныя асаблівасці не вылучаюцца, а ствараюць сінтэзную карціну светаўспрымання. Асноўным захавальнікам традыцыйнай культуры выступае сям'я, а яе рэтранслятарам — мастацкія калектывы, якія дзейнічаюць пры беларускіх культурных арганізацыях і ўстановах: „Сябрына" (Вільня), „Шчара" і „Світанак" (Вісагінас), „Спадчына" (Друскенікі), „Купалінка" (Клайпеда) і іншыя.

— ***Ці вядзецца дыялог паміж культурамі на Віленшчыне?***

— Беларускія нацыянальныя і міжкультурныя элементы праяўляюцца ў дыялагічных адносінах культур, напрыклад, у вёсцы Ашашнікі жанчыны-беларускі ў літоўскія сем'і прынеслі сваю традыцыйную культуру і моўныя элементы, у першую чаргу, бытавую лексіку. У Салечніцкім раёне сустракаюцца фальклорныя творы, якія па-літоўску даслоўна паўтараюць беларускія класічныя жніўныя і восеньскія песні, такія як „Ах ты, сонца, сонейка", „Ужо вечар вечарэе", „А ў цёмным лесе мядзведзь рыкае" і інш., што пацвярджае глыбіню і фундаментальнасць беларуска-літоўскага культурнага ўзаемадзеяння.

— ***Дзякуем за размову і чакаем Вашых разваг на наступных міжнародных навуковых канферэнцыях аб нацыях на пагранічча.***

Размаўляла Міра ЛУКША

Адгаданка

1. выхаванец дзіцячага дома, 2. прадмет, які служыць цэллю пры стральбе, 3. пераход ненаціскных галосных [о], [э] пасля цвёрдых зычных у [а], 4. месца злучэння сшытых кавалкаў тканіны, 5. ранг чыноўніка, 6. дробнае бяскрылае насякомае, якое паразітуе на целе чалавека (*Pediculus humanus*), 7. электронная лямпа з трыма электродамі, 8. доўгі кавалак тканіны, абгорнуты некалькі разоў вакол галавы мусульманіна, 9. партнёрка Адама, 10. сканцэнтраванасць думак.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — шатландская пагаворка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.



Адказ на адгаданку з 40 нумара

Веер, зігота, каўтун, Кіеў, лёд, мыс, пяць, самба, хор, чарпак.

Рашэнне: **Рупная пчала ўмее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лявону Федаруку** з Рыбал і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 180 egz.

Партнёрства з засцярогамі

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

За нарыхтоўкай заявак у рамках еўрасаюзнай праграмы Усходняга партнёрства пераконвалі падляшскіх чыноўнікаў самакіравання віцэ-старшыня сеймавай камісіі замежных спраў Роберт Тышкевіч, падляшскі маршалак Яраслаў Дважанскі ды прадстаўнік МЗС Марцін Жахоўскі. У ходзе адмысловай сустрэчы найбольшае зацікаўленне выклікалі, аднак, заявы віцэ-консул Беларусі ў Беластоку Наталлі Міськевіч, якая надзвычай канкрэтна прадставіла спадзяванні беларускага боку адносна Партнёрства.

Прыгадайма, што Усходняе партнёрства з'яўляецца праграмай, якая была запушчана ў ход 7 мая г.г. на еўрасаюзнай сустрэчы ў вярхах у Празе шляхам прыёму супольнай заявы еўрапарламента; гэта вынік польска-шведскай ініцыятывы. Яе мэтай збліжэнне і пазнейшае згуртаванне з Еўрасаюзам Арменіі, Азербайджана, Украіны, Малдовы, Грузіі і Беларусі.

— Усходняе партнёрства лічым адным з флагманаў польскай усходняй палітыкі, а зараз і еўрасаюзнай палітыкі суседства, — запэўніваў дэпутат Тышкевіч, які ачольвае парламенцкую групу па справах Беларусі. — Польскі ўрад прагне, каб гэтая праграма стала асноўным напрамкам польскай прэзідэнцыі ў ЕС у 2011 годзе.

Марцін Жахоўскі з МЗС Польшчы (пазней не хацеў гутарыць з журналістамі, бо „не меў згоды начальства") сцвердзіў:

— Усходняе партнёрства дае магчымасць пераадолення апошніх падзелаў у Еўропе.

Ён прыгадаў, што ў рамках Партнёрства дагэтуль атрымалі дабро дзве праграмы: культурная і кранаючая „заснавання ніцей супрацоўніцтва паміж бізнесавымі суб'ектамі Еўрасаюза і Усходняй Еўропы". Да 2013 года гэтая ініцыятыва мае абсарбаваць звыш трох мільярдаў еўра. У ліку яго мэт Марцін Жахоўскі пералічыў падтрымку палітычных і эканамічных рэформаў ва ўсходнееўрапейскіх краінах ды мацаванне повязей паміж самімі краінамі гэтай часткі кантынента, без непасрэднага ўмяшальніцтва і без спроб вырашання канфліктаў паміж ахопленымі Партнёрствам краінамі (як у выпадку Арменіі і Азербайджана). Найважнейшай будзе дапамога ў шанаванні правоў чалавека, запуск рыначных механізмаў і добрага кіравання, а таксама ўраўнаважаны прагрэс. Ён дадаў у гэтым месцы:

— Няма ідэальнай дзяржавы, якая поўнасцю праводзіла б гэтыя прынцыпы. Напачатак мае быць запушчана праграма супрацьдзеяння прыродным і антрапагенным бедствам. Чарговымі, пачынаючы з наступаючага года, будуць праграмы спраўнага кіравання граніцамі, падтрымкі малых і сярэдніх прадпрыемстваў, аднаўляльных энергарэсурсаў і паўднёвых энергетычных калідораў.

З беларускага боку быў прадбачаны ўдзел у сустрэчы прадстаўніка мінскага МЗС Аляксандра Авяр'янава (саветнік-міністр). Ён не прыехаў, мабыць, не быў гэта адпаведны ягонаму рангу ўзровень сустрэчы. Напярэдадні сустрэчы гэтую ролю даручана віцэ-консул Наталлі Міськевіч.

— Беларусь разглядае сябе паўнапраўным удзельнікам Усходняга партнёрства, — заявіла, і паінфармавала, што ў Беларусі створаны міжведамасныя рабочыя групы па справах кожнай з галін Партнёрства, а іх работу зладжвае першы віцэ-прэм'ер РБ Уладзімір Сямашка. Гаварыла яна пра спадзяванні Беларусі, у тым ліку пра палягчэнне доступу на еўрасаюзныя рынкі ў перспектыве свабоднага гандлю з краінамі ЕС, пра развіццё крэдытна-фінансавага супрацоўніцтва, фінансаванне нацменшасных праграм, супрацоўніцтва ў барацьбе з нелегальнай міграцыяй, развіццё магчымасцей у сферы юстыцыі і памежнай інфраструктуры, інтэграцыі энергетычных сістэм.

— Станоўча ставімся да зносу візавага рэжыму. Беларусь, — сказала віцэ-консул Міськевіч, — зацікаўлена м.інш. транзітам адэскай нафты па беларускім адрэзку нафтаправода „Дружба", перадачай энергіі з постсавецкіх краін у Еўрасаюз (Рось — Нарва, Рось — Беласток), таможнымі палёгкамі ў таварным руху, паляпшэннем таможнага абмену паміж Беларуссю і Літвой, Латвіяй ды Польшчай, мадэрнізацыяй чыгуначных ліній паміж Беларуссю, Літвой і Украінай, развіццём дарожнай інфраструктуры Клайпеда — Вільня — Мінск — Кіеў ды Варшава — Мінск, спраўнейшым перавозам тавараў ад Чорнага да Балтыйскага мора, пабудова дадатковых рэзервуараў газу. Спадзяемся, — падкрэсліла, — што Партнёрства не будзе ствараць зон уплываў і новых бар'ераў. Праекты павінны ўключаць таксама Расію, бо гэта павысіць іх вартасць.

Назвала яна непрымальнай для Беларусі прапанову удзелу ейнай краіны ў новай структуры Парламенцкай асамблеі Еўранест, якую будзе ажыццяўляць Партнёрства (еўрасаюзныя краіны прапануюць удзел у ёй з беларускага боку так парламентарыяў, як і прадстаўнікоў пазапарламенцкай апазіцыі). На канец звярнулася да падляшскіх чыноў па самакіраванню:

— Прыязджайце, тлумачце нам, як гэта рабіць. Вазьміце на сябе найважнейшую частку ажыццяўлення тых праектаў.

І пахваліла, прыгадваючы польска-беларускае супрацоўніцтва паміж гмінамі і раёнамі:

— Гэты рэгіён ужо гатовы на Партнёрства.

У кулуарах сустрэчы паставілі мы некалькі пытанняў дэпутату Тышкевічу.

— ***Што ў рамках Усходняга партнёрства з польска-беларускім супрацоўніцтвам няўрадавых арганізацый? Дагэтуль гутарка ішла пра супрацоўніцтва на ўрадавым узроўні; мажліва і паміж органамі самакіравання.***

— У лістападзе мае афіцыйна пачаць працу Форум грамадзянскай супольнасці, створаны арганізацыямі еўрасаюзных ды ахопленых Усходнім партнёрствам краін. Вядома мне, што пра свой удзел заявілі многія — заслужаныя для абароны правоў чалавека і нагляду еўрапейскіх стандартаў — арганізацыі з Беларусі. Я ўпэўнены, што яны будуць паўнапраўна ўдзельнічаць у гэтым форуме і карыстацца Партнёрствам.

— ***Ці таможнае пагадненне, якое з пачаткам наступаючага года ахопіць Беларусь, Расію і Казахстан, можа нейкім чынам паўплываць на рэалізацыю Усходняга партнёрства ў яго эканамічным вымярэнні?***

— Не спадзяюся. Юрыдычная логіка Партнёрства такая: на столькі даная краіна можа супрацоўнічаць з Еўрасаюзам, наколькі можа прыняць ягоныя юрыдычныя здабыткі таксама ў галіне памежнага руху і гаспадарчага права. Наколькі яны змогуць наблізіцца да еўрасаюзных законаў і норм, на столькі могуць разлічваць на карысці з поўнамаштабнага супрацоўніцтва.

— ***Як бы Вы пракаментавалі нядаўняе выказванне Андрэя Саннікава, лідара руху Еўрапейская Беларусь: Усходняе партнёрства можа сапраўды стаць перспектыўным этапам на шляху да ўваходу Беларусі ў Еўрасаюз, але не пры рэжыме Лукашэнкі?***

— Я магу пагадзіцца з гэтым меркаваннем. Пакуль пра перспектыву членства гаворкі няма. Спярша такую волю мусіла б выказаць сама Беларусь, але сёння яе не выказвае. Партнёрства мае быць формай штораз глыбейшага супрацоўніцтва ды, у гэтым выпадку, інструментам рэфармавання беларускай дзяржавы. Мы, Польшча, не хочам, каб апошняе ўзбуйненне Еўрасаюза было канчатковым. Калі нехта думае, што можа ўстанавіць спецыяльныя адносіны з Еўрасаюзам без аглядкі на асноўныя вартасці і вольнасці ды іншыя еўрасаюзныя правапарадкі, той расчаруецца.

— ***Як Вы ацэньваеце выступленне спадарыні віцэ-консул Міськевіч?***

— Вельмі станоўча наконт таго, што яна гаварыла пра мясцовы, трансгранічны абмен, наконт закліку польскіх самаўрадаў дапамагаць самаўрадам беларускім. Калі разглядаць Еўранест, дык гэта еўрасаюзная парламенцкая ініцыятыва, не ўрадавая. Цяперашні парламент Беларусі выбраны недэмакратычным шляхам і не можа ў гэтай вялікай міжпарламенцкай камісіі ўдзельнічаць на тых асновах, што іншыя парламенты. Не думаю, што наконт гэтага пытання еўрапейскія парламентарыі памянялі погляды. Мяркую, што ў Еўранесце Беларусь не прыме ўдзелу. А шкада.

Сустрэча, у якой удзельнічаў таксама прадстаўнік Управы замежных спраў Аўтаномнай Рэспублікі Крым (Украіна), перакладалася з польскай мовы на рускую. Прадстаўнікі Крыма і Беларусі прамаўлялі па-руску.

07.11 – 13.11

(22.03. — 20.04.) Ахвотна зарызыкуеш і не ўцячэш перад выклікамі. Асенняе надвор'е не перашкодзіць табе ў гарачых раманах, фліртах і добрай забаве. Будуць цябе паліць жарсці і крайнія эмоцыі. Твой круг сяброў пашырыцца на асабліва цікавыя асобы.

(21.04. — 21.05.) Энергію засяродзіш на блізкіх. Ад 8.11. ты і каханая асоба дасягняце поўнасці паразумення. Хоць 9-13.11. партнёр можа аказацца гарача зайздросным за твае поспехі; гэта таксама некарысны час на размовы з начальнікамі. Хтосьці, каго толькі ведаеш здалёк, акажацца тваёй братняй душой.

(22.05. — 22.06.) 9-13.11. — знакаміты час на здабыванне розных умеласцей. Усё, што невядомае, прывітаеш з радасцю і дастасуешся да новых умоў. Будзеш узорам сумленнасці і працавітасці. Праца дасць табе прыемнасць і задавальненне. Хутка ўбачыш плён сваіх дзеянняў.

(23.06. — 23.07.) Смела прызнаешся ў каханні (8-12.11.). Будзеш такі ўнушальны, што ніхто табе не адмовіць. З 12.11. (да 16.11.) зможаш адрабіць фінансавыя страты. Удадуцца пачатыя інтарэсы, можаш штось добра купіць. 9-13.11. асцерагайся людзей, якія маюць благую рэпутацыю.

(24.07. — 23.08.) У дамска-мужчынскіх справах не будзь лішне самаўпэўненым, бо хтосьці кепска адчытае твае намеры. Твае ідэі і шырокія планы можа прытармазіць сям'я. З 13.11. (да 17.11.) адвага, сіла энергія; ідэальна справішся з фінансамі. 8-12.11. не пераацэньвай сябе і сваіх магчымасцей.

(24.08. — 23.09.) 9-13.11. засыплеш партнёра неардынарнымі задумамі і захопіш творчым палам. 7-10.11. хтось можа абвінаваціць цябе ў ганарлівасці і пагардзе да тых, каму горш вядзецца. На працы рыхтуюцца змены, дык рыхтуйся і ты.

(24.09. — 23.10.) Пад уплывам секстылю Плутона да Венеры (7-11.11.) лёгка дастасуешся да кожнай сітуацыі. Моцная воля і трываласць. Правільныя рашэнні, наладзіш кантакты з асобай, якая будзе вельмі прыдатнай.

(24.10. — 22.11.) 7-11.11. — кампанейскія поспехі. Сімпатыя атачэння, пачуццё гумару гарантуюць табе поспех у прыватных і прафесійных справах. З 10.11. (другая і трэцяя дэкада месяца) — найбольш спрыяльны перыяд для прафесійных спраў. З 10.11. да 20.11. цяжкія задачы вызначыць табе квадратура Плутона з Сатурнам. Можаш неасцярожна знішчыць штосьці, над чым так доўга працаваў!

(23.11. — 22.12.) 8-12.11. не падыдзі абыякава да справы, якая патрабуе вялікай асцярожнасці. Не ўслухайся ў хвальбу. Яшчэ ў гэтым тыдні не вельмі ўдадуцца твае планы. У пару ўпусці свежае паветра — можа, выберацеся разам за мяжу?..

(23.12. — 20.01.) Будзе хацецца змен, ды колецца. Так зоркі ўкладваюцца раз на больш за дзесятак гадоў: прадбачваецца час пералому! Найбольшы крызіс у Казярогаў народжаных перад 27.12. — перад вамі жыццёвая праверка! З 12.11. шарпаніна з лёсам і дарога супраць плыні можа кепска скончыцца.

(21.01. — 19.02.) Будзеш кемлівы, адважны, моцны, а прытым прыцягальны. Прыхільнасць лёсу (горш будзе толькі Вадалеям народжаным перад 28.01.). Калі маеш да кагосьці жаль, выкажы гэта проста ў вочы і да справы не вяртайся. Шмат работы, але і кашалёк таўсцее.

(20.02. — 21.03.) 10-14.11. перашкоды ў прафесійных справах; не будзь лішне ўступчывы. Дзякуючы інтуіцыі пазбегнеш небяспекі. Падтрымка ад блізкіх, магчымае запрашэнне за мяжу на даўжэйшы час. На працы не дайся ўцягнуцца ў інтрыгі.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960